Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 КАСТРЫЧНІКА 2014 г. АЎТОРАК № 195 (27805) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

НАША БЯЗМЕЖНАЯ ЎДЗЯЧНАСЦЬ

Дарагія жанчыны!

Ад усёй душы віншую вас з Днём маці!

Гэта светлае свята блізкае сэрцу кожнага чалавека, бо бацькоўскае цяпло сагравае нас з першай хвіліны жыцця, а незаменная мацярынская любоў і мудрая бацькоўская парада робяць нас больш моцнымі і дапамагаюць пераадольваць любыя нягоды.

Моцная сям'я — залог працвітання грамадства, таму такое вялікае значэнне ў нашай краіне ўдзяляецца ахове мацярынства і дзяцінства, павышэнню прэстыжу сямейных каштоўнасцяў і ўмацаванню ў моладзі аўтарытэту бацькоў. І гэты святочны дзень з'яўляецца добрай падставай яшчэ раз нагадаць аб тым, што мы сапраўды шчаслівыя толькі тады, калі шчаслівыя нашы блізкія.

Сёння мы аддаём даніну ўдзячнасці кожнай маці. Нізкі паклон шматдзетным маці і жанчынам, якія выхоўваюць прыёмных дзяцей-сірот. Бязмежная ўдзячнасць жанчынам старэйшага пакалення — нашым маці, бабулям і прабабулям. Дзякуй вам за цярплівасць і мужнасць, сардэчнасць і дабрыню. Мы ў неаплатным даўгу перад вамі.

Мілыя мамы! Няхай у вашых дамах заўсёды жывуць радасць і ўтульнасць, будуць здаровыя родныя, а вас акружае шчырая любоў дзяцей, унукаў і праўнукаў.

Здароўя вам, міру і дабрабыту!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

«Шчасце, што ты ў мяне ёсць»

Восень-2014. Мінск. Лошыцкі парк.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

АСНОВА АДНОСІН — ЭКАНОМІКА

БЕЛАРУСЬ НЕ РАЗГЛЯДАЕ СЯБЕ Ў АДРЫВЕ АД РАСІІ

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з губернатарам Свярдлоўскай вобласці Яўгенам Куйвашавым.

Фота БЕЛТА.

«Толькі ў тым выпадку, калі мы будзем процістаяць усялякім пагрозам разам, мы здольны выстаяць і выжыць, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Сведчаннем таго з'яўляюцца падзеі ў нашай суседняй краіне. Хто мог бы падумаць, што такое наогул можа быць?» «Я думаю, мы былі і будзем разам», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што асновай беларуска-расійскіх адносін з'яўляецца эканоміка. «Калі мы будзем нармальна рухацца наперад у гандлёва-эканамічнай сферы, то ніякія буры і ўраганы нам не страшныя», — упэўнены Прэзідэнт.

У гэтай сувязі, адзначыў Прэзідэнт, наша краіна гатова пашыраць вытворчую кааперацыю са Свярдлоўскай вобласцю. «Гэта добрае месца для стварэння базы вытворчай кааперацыі з беларускімі прадпрыемствамі і пляцоўка для прасоўвання сумеснай прадукцыі на Урал, у Сібір і Далёкі Усход», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў важнасць супрацоўніцтва з расійскімі рэгіёнамі, якое, на яго думку, з'яўляецца фундаментам адносін з Расіяй. Ён нагадаў, што былі складаныя часы ў беларуска-расійскім супрацоўніцтве, і тады адносіны выратавала менавіта супрацоўніцтва з рэгіёнамі.

Вітаючы дэлегацыю Свярдлоўскай вобласці, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Гэта эканамічна развітая тэрыторыя Расіі з высокім узроўнем дзелавой, культурнай і грамадскай актыўнасці. Ваша вобласць па праве з'яўляецца надзейным і перспектыўным партнёрам Беларусі».

Па выніках мінулага года тавараабарот паміж Беларуссю і Свярдлоўскай вобласцю перасягнуў паўмільярда долараў. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што адбылося некаторае яго зніжэнне, што не з'яўляецца нармальным. Прэзідэнт таксама выказаў перакананне, што вынікам цяперашняга візіту дэлегацыі Свярдлоўскай вобласці будзе, як мінімум, аднаўленне ранейшага тавараабароту. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь гатова шырока ўзаемадзейнічаць са Свярдлоўскай вобласцю па ўсіх напрамках, у прыватнасці, пастаўляць сельскагаспадарчую, аўтамабільную, дарожна-будаўнічую, камунальную тэхніку, якая добра знаёмая ўральцам.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што на міжнароднай прамысловай выстаўцы «Інапрам», якая штогод праводзіцца ў Екацярынбургу, Беларусь тры гады запар паспяхова дэманструе прадукцыю вядучых машынабудаўнічых прадпрыемстваў, дасягненні ў галіне навукі, прамысловасці, інавацый. Беларусь таксама гатова падзяліцца вопытам перапрацоўкі сельгаспрадукцыі і пастаўляць прадукты харчавання, стварацъ сумесныя прадпрыемствы.

Кіраўнік дзяржавы таксама выказаў упэўненасць, што ў выніку гэтага візіту «мы выйдзем на канкрэтныя дамоўленасці, якія забяспечаць пашырэнне ўсебаковых сувязяў Беларусі і Свярдлоўскай вобласці».

Яўген Куйвашаў у сваю чаргу адзначыў, што Свярдлоўская вобласць разлічвае на больш актыўнае ўзаемадзеянне з Беларуссю па ўсіх напрамках. Губернатар падкрэсліў, што адным з прыярытэтаў міжрэгіянальнага супрацоўніцтва Свярдлоўскай вобласці з'яўляюцца кантакты з краінамі СНД. «І хоць Беларусь аддзяляюць ад нас тысячы кіламетраў, нас аб'ядноўвае імкненне жыць і працаваць разам», — сказаў губернатар.

Пачынаючы з 2001 года, Беларусь і Свярдлоўская вобласць штогод звяраюць гадзіннікі супрацоўніцтва, падпісваючы каротказатэрміновыя планы сумесных дзеянняў. На маючым адбыцца 14 кастрычніка пасяджэнні Савета дзелавога супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Свярдлоўскай вобласцю будзе разгледжаны бягучы стан спраў, а таксама намечаны дзеянні на перспектыву. Губернатар адзначыў, што 94 чалавекі ў складзе свярдлоўскай дэлегацыі прадстаўляюць розныя сферы, а значыць і дасягнутыя дамоўленасці будуць датычыцца не толькі эканомікі, але і іншых галін.

■ З нагоды

МАЛІТВЫ ДЛЯ МАМЫ

У ЗАСЛАЎІ ВІНШАВАЛІ САМЫХ ГАЛОЎНЫХ У СВЕЦЕ ЖАНЧЫН

...Кожная з іх выхоўвае траіх, чацвярых і нават шасцярых дзяцей. Гасцямі і ўдзельніцамі свята, якое адбылося ў старажытным Заслаўі ў мінулую суботу, напярэдадні Пакрова Прасвятой Багародзіцы, сталі незвычайныя шматдзетныя мамы і актывісткі найбуйнейшага грамадскага жаночага аб'яднання з усіх рэгіёнаў краіны.

— Я вельмі добра разумею значнасць гэтага свята — Дня маці, бо я сама мама, можна нават сказаць, у другім пакаленні: у мяне ўжо чацвёра ўнукаў, — зазначыла **старшыня Беларускага саюза жанчын Надзея ЕРМАКОВА.** — Натуральна, сабраць усіх матуль на адзінае вялікае свята немагчыма. Таму штогод нашы абласныя арганізацыі стараюцца выбраць і дэлегаваць тых, хто найбольш варты ўсялякай пашаны і падтрымкі.

Сёлета, напрыклад, з усіх абласцей і Мінска прыехалі на свята не проста мамы, але і вельмі прыгожыя і моцныя жанчыны, якім няпроста жывецца: яны засталіся ў сваіх вялікіх сем'ях і за маму, і за тату, і, да таго ж, гадуюць і выхоўваюць разам з іншымі сваімі дзецьмі асаблівых дзетак-інвалідаў з самымі рознымі дыягназамі.

Гледзячы на маладую, прыгожую, упэўненую ў сабе Таццяну Сімончык з Баранавічаў, немагчыма ўявіць, колькі выпрабаванняў ёй давялося прайсці. У Таццяны чатыры з паловай гады таму нарадзілася тройня, што ўжо само па сабе — няпростае выпрабаванне для любой сям'і. Але ў дадатак адзін з сыночкаў з'явіўся на свет з дыягназам ДЦП.

— Наш раённы тэрытарыяльны цэнтр вельмі дапамог, — распавядае шматдзетная маці. — Прадаставілі няню. Канешне, калі б усе дзеткі былі здаровымі, было б значна лягчэй. А дзіця з асаблівасцямі патрабуе шмат часу.

Але Таццяна не з тых, хто складвае рукі і чакае дапамогі ад іншых — сына яна возіць на лячэнне за ўласныя сродкі, матэрыяльна дапамагае садку, які наведваюць дзеці, і — не чакае цудаў, а змагаецца з хваробай з усіх сіл.

У мінчанкі Алены Даневай таксама трое дзяцей. Малодшы яшчэ з нараджэння атрымаў «букет» такіх дыягназаў, што многія медыкі пераконвалі маму адмовіцца ад дзіцяці: «Вы ж маладая, народзіце яшчэ здаровенькае немаўля!».

СТАР. 2

У ліку пераможцаў конкурсу «Моцная сям'я — моцная дзяржава» і «Звязда».

Фота БЕЛТА.

■ Надвор'е

З СЕРАДЫ — ДАЖДЖЫ І ПАХАЛАДАЕ

У бліжэйшыя суткі тэрыторыя Беларусі яшчэ застанецца пад уплывам цёплых паветраных мас з «прапіскай» на паўднёвым захадзе Еўропы, паведаміў начальнік аддзела метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Аляксандр БЯГАНСКІ.

Таму сёння будзе пераважна без ападкаў, толькі месцамі па паўночнай палове краіны пройдуць непрацяглыя дажджы. Максімальная тэмпература паветра складзе плюс 13-19 градусаў. Потым надвор'е пачне паціху пагаршацца. У сераду і чацвер Беларусь трапіць пад уплыў цыклону, які рухаецца да нас з боку Польшчы. Таму ў гэтыя дні паўсюдна чакаюцца дажджы рознай інтэнсіўнасці. Уначы і раніцай месцамі туман і пахаладае. Тэмпература паветра ў ноч на сераду будзе яшчэ 7-15 цяпла, удзень — плюс 11-18 градусаў, па Гомельскай вобласці нават да 20 цяпла. У ноч на чацвер стане 6-12 цяпла, а ўдзень тэмпература паветра павялічыцца толькі да плюс 8-15 градусаў, праўда на поўдні — да 18 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, нават напрыканцы тыдня ў Беларусі захаваецца дажджлівае надвор'е і стане на 2-3 градусы халадней. Разам з тым, у ноч на пятніцу замаразкаў яшчэ не прадбачыцца. Так, крыху памёрзнем, але ў трэцяй дэкадзе кастрычніка мы чакаем чарговую хвалю бабінага лета.

Сяргей КУРКАЧ.

ЛІЧБА ДНЯ

На $1 млрд 825,1 млн

паставіла Беларусь калійных угнаенняў у студзені—жніўні 2014 года на знешнія рынкі. За восем месяцаў гэтага года краіна павялічыла экспарт калійных угнаенняў у 1,57 раза ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам. У той жа час у грашовым выражэнні экспарт вырас на 15,2%. Непрапарцыянальны рост экспарту хлоркалію ў фізічным і грашовым выражэнні абумоўлены тым, што сярэдняя цана тоны экспартуемых угнаенняў (у пераліку на 100% дзеючага рэчыва) у студзені—жніўні знізілася ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам на 26,2% да 465,2 долара.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.10.2014 г.

Долар ЗША	10650,00	▲
Еўра	13480,00	▼
Рас. руб.	264,00	▼
Укр. грыўня	823,79	▲

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У Вярхоўную Раду ўнеслі законапраект аб выхадзе з СНД

У Вярхоўнай Радзе Украіны зарэгістраваны законапраект аб спыненні дзеяння пагаднення аб стварэнні СНД. Як паведамляецца на сайце ўкраінскага парламента, ініцыятарамі праекта выступілі дэпутаты ад партыі «Свабода». Тэкст самога законапраекта пакуль не апублікаваны. Цікава, што 9 кастрычніка кіраўнік пастаяннай дэлегацыі ў міжпарламенцкай асамблеі краін СНД, дэпутат Вярхоўнай Рады Сяргей Грынявецкі паведаміў, што Кіеў цяпер не разглядае пытанне выхаду Украіны з СНД. «Міністэрства эканомікі прадаставіла інфармацыю, што выходзіць з СНД немэтазгодна з пункту гледжання эканамічных інтарэсаў Украіны, бо СНД — гэта не толькі Расія. Пасля гэтага такое пытанне наогул не разглядаецца», — растлумачыў Грынявецкі. Дырэктар дэпартамента інфармацыйнай палітыкі МЗС Украіны Яўген Перабейнос растлумачыў: «Каб пачаць працэс выхаду з нейкай міжнароднай арганізацыі, рашэнне павінна прыняць Вярхоўная Рада. Пакуль такога рашэння няма».

Эва Маралес абвясціў аб сваёй перамозе на выбарах у Балівіі

Дзейны прэзідэнт Балівіі Эва Маралес абвясціў аб сваёй перамозе на выбарах па выніках экзіт-полаў, паведамляюць інфармагенцтвы. Паводле апошніх даных, Эва Маралес сабраў 61% галасоў выбаршчыкаў. Акрамя таго, яго «Рух да сацыялізму» захаваў большасць у Сенаце і Палаце дэпутатаў краіны. Найбліжэйшы сапернік дзеючага кіраўніка дзяржавы прадпрымальнік Самуэль Дарыа Медзіна, які ўзначальвае правацэнтрысцкі «Фронт нацыянальнага адзінства», мае падтрымку 18% электарату. На трэцім месцы знаходзіцца былы прэзідэнт Балівіі Хорхе Кірога.

У Расіі прапанавалі кампенсаваць 75% выдаткаў на фітнес

У Расіі падрыхтаваны законапраект, які прапануе кампенсаваць грамадзянам РФ палову выдаткаў на заняткі спортам і фітнесам з федэральнага бюджэту. Як пішуць «Известия», з падобнай ініцыятывай выступіў дэпутат Дзярждумы ад «Справядлівай Расіі» Алег Нілаў. Дэпутат прапануе, акрамя 50-працэнтных выплат з федэральнага бюджэту, абавязаць працадаўцаў кампенсаваць яшчэ 25% выдаткаў на фітнес. Работніку, які жадае займацца спортам, застанецца самому аплаціць толькі 25%.

Раней Міністэрства працы РФ уключыла заняткі фізкультурай і спортам у тыповы пералік мерапрыемстваў па паляпшэнні ўмоў і аховы працы і зніжэння ўзроўняў прафесійных рызык, якія рэалізуюцца працадаўцам.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

2-3 кубкі чаю ў дзень могуць выратаваць ад астэапарозу

Як перадае The Daily Mail, аматары чаю радзей ламаюць сцягно, чым людзі, якія наогул яго не п'юць. Рызыка пераломаў скарачаецца на 28%, калі выпіваць 1-2 кубкі, і на 37%, калі выпіваць 2-3. А вось 3-4 кубкі чаю зніжалі рызыку на 21%. Пры гэтым кава не мае падобнага эфекту. Мабыць, флаваноіды, злучэнні з чаю, якіх у гэтым напоі больш, чым у каве, дапамагаюць утварацца новай касцявой тканцы. Таксама вядома, што касцявая тканка становіцца больш шчыльнай пад уздзеяннем фторыстых злучэнняў, кальцыю і іншых мінералаў, якія таксама змяшчаюцца ў гарбаце. Кітайскія спецыялісты, якія стаяць за апошнім даследаваннем, улічылі даныя прыкладна 200000 чалавек. Раней было таксама даказана, што ўжыванне піва пазітыўна ўплывае на здароўе касцей. Лічыцца, што высокая колькасць крэмнію ў піве актывізуе ўтварэнне новых касцявых клетак.

КАРОТКА

Пасля наведвання Беларусі больш за 80% іншаземцаў мяняюць сваё меркаванне аб краіне ў лепшы бок. Аб гэтым сведчаць вынікі апытання, праведзенага латвійскім рэкламным агенцтвам «AD Hunters Baltics».

У Беларусі 45,9% жанчын знаходзяцца ў рэпрадуктыўным узросце (15-49 гадоў).

Выплату заработнай платы пратэрмінавалі на 1 кастрычніка 2014 года 222 арганізацыі краіны.

Колькасць беспрацоўных у Беларусі ўзрасла да 21,8 тыс. чалавек пры стабільным невысокім узроўні зарэгістраванага беспрацоўя (0,5%).

У Мінску на асенніх кірмашах выхаднога дня з 20 верасня прададзена 1372 т бульбы, 1487 т агародніны і 208 т яблыкаў.

Жаночая зборная Беларусі па баскетболе пасля нядаўняга чэмпіянату свету ў Турцыі ўзнялася на адзін радок у рэйтынгу Міжнароднай федэрацыі баскетбола (ФІБА) і заняла 9-ю пазіцыю.

■ Купляй сваё

АЙЧЫННАЕ — У ЦАНЕ

Статыстыка сведчыць, што беларусы сталі купляць больш прадуктаў харчавання і прамысловых тавараў айчыннай вытворчасці.

Паводле звестак Белстата, у агульным аб'ёме тавараабароту ўзрасла доля мяса беларускай вытворчасці, уключаючы мяса хатняй птушкі, каўбасных вырабаў, вяндліны, мясных паўфабрыкатаў і кансерваў. Значна павялічылася доля продажу айчыннага алею. Калі за студзень — кастрычнік мінулага года яна складала 30,5%, а доля імпартнага алею — 69,5%, то сёлета ўдзельная вага продажу алею беларускіх вытворцаў павялічылася да 40,9%, а імпартнага знізілася да 59,1%.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Не здраджваюць беларусы і свайму цукру: доля яго продажаў складае 99,8%. Узрос таксама аб'ём продажаў нашых круп і макаронных вырабаў, сокаў. У літаральным сэнсе статыстыка пацвярджае і прымаўку, што свая кашуля бліжэй да цела: доля беларускай верхняй вопраткі за студзень-люты склала 74,4% (за аналагічны перыяд летась — 64,4%). Павысіўся попыт на айчынны трыкатаж, панчошна-шкарпэткавыя вырабы, абутак.

За студзень—кастрычнік аб'ём продажаў беларускіх халадзільнікаў павялічыўся амаль да 80%, пральных машын — да 68% (летась гэтыя лічбы складалі 78% і 42% адпаведна).

Узрасла доля айчынных сінтэтычных мыйных сродкаў у агульным тавараварочаце (47% супраць леташніх 34%). А вось з беларускай парфумай і касметыкай сітуацыя значна не змянілася: доля тавараў айчыннай вытворчасці гэтай групы трымаецца на ўзроўні 30%. Падобная карціна і з аб'ёмам продажаў нашай фармацэўтыкі: два апошнія гады ён складае 22—24%.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

ISSN 1990 - 763X

■ Сістэма адукацыі: грамадскае абмеркаванне

КАБ ШКОЛА НЕ АДСТАЛА АД ЖЫЦЦЯ…

Як зрабіць змест навучання больш практыкаарыентаваным і выпусціць у жыццё канкурэнтаздольнае пакаленне? Якой павінна быць III ступень школы? Чаму ва ўстановах адукацыі не гучыць родная мова? Як дэбюракратызаваць работу школы і зменшыць папяровую нагрузку на педагогаў? Як павысіць прэстыж працы настаўніка? Гэтыя і многія іншыя пытанні абмяркоўваліся на пасяджэнні рабочай групы па комплексным аналізе сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь. Нарада адбылася на базе 20-й сярэдняй школы г. Барысава, а да ўдзелу ў дыскусіі былі запрошаны як кіраўнікі сістэмы адукацыі, так і педагогі-практыкі, фіналісты і пераможцы апошняга і папярэдніх конкурсаў «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь».

СЁННЯ І ЗАЎТРА

— На жаль, але мы ў апошнія дзесяцігоддзі некалькі самазаспакоіліся, і наша школа ўсё больш небяспечна пачынае адставаць ад жыцця, а ўсе спробы процістаяць гэтаму зводзяцца пераважна да закручвання гаек, да далейшай бюракратызацыі школы, усё большай рэгламентацыі дзейнасці як кіраўнікоў навучальных установ, так і настаўнікаў,— падзяліўся сваімі думкамі з удзельнікамі нарады **кіраўнік рабочай групы, віцэ-прэм'ер Беларускага ўрада Анатоль ТОЗІК.**— І вынік атрымліваецца з дакладнасцю да наадварот — сітуацыя яшчэ больш ускладняецца: са школы сыходзяць ініцыятыва, сыходзяць таленавітыя настаўнікі, працягвае зніжацца якасць адукацыі, а школай пачынаюць камандаваць усе запар: і Міністэрства ўнутраных спраў, і МНС, і санстанцыя, і іншыя… Мы павінны прапанаваць рашэнні, якія «разняволілі» б школу, дазволілі рыхтаваць адукаваных людзей, якія змогуць забяспечыць нашай краіне месца сярод самых паспяховых краін свету. Якая школа сёння — такая краіна заўтра.

Больш за палову апытаных бацькоў і педагогаў (54% і 56% адпаведна) падзяляюць думку пра тое, што профільнае навучанне ў старшых класах можа стаць альтэрнатывай рэпетытарству.

Лічу, што мы маглі б неадкладна дэбюракратызаваць школу і забараніць умешвацца ў вучэбны працэс. Мы можам заканадаўча ўстанавіць мінімум дакументаў, якія павінен весці настаўнік, класны кіраўнік і адміністрацыя школы. Мы маглі б неадкладна забараніць розныя разнарадкі і справаздачы кшталту падпіскі на газеты і часопісы. Трэба забараніць прымусовае наведванне школьнікамі спартыўных і відовішчных мерапрыемстваў праз задзейнічанне адміністрацыйнага рэсурсу. А знімаць дзяцей з урокаў, я лічу, увогуле можна толькі ў надзвычайнай сітуацыі. І я прапанаваў бы рабіць гэта толькі з дазволу міністра адукацыі, нават калі размова ідзе пра аддаленую сельскую школу.

СУСВЕТНАЯ КУЛЬТУРА І МАТЭМАТЫКА

Праблема нумар адзін — зніжэнне ўзроўню падрыхтоўкі вучняў па дакладных навуках і якасць адукацыі, якая не адпавядае сучасным патрабаванням.

Намеснік міністра адукацыі Васіль БУДКЕВІЧ канстатаваў існаванне недахопаў у вучэбных праграмах і планах, недасканаласць падручнікаў і прабелы ў кадрах: дэфіцыт настаўнікаў матэматыкі, фізікі, хіміі, біялогіі і не заўсёды высокі кваліфікацыйны ўзровень настаўнікаў-прадметнікаў.

— Матэрыял мы сёння вывучаем той жа, што і 20–30 гадоў таму, але колькасць урокаў матэматыкі ў тыдзень скарацілася ў 1,5 раза,— падзялілася сваім меркаваннем **настаўніца матэматыкі з 23-гадовым стажам 20-й сярэдняй школы г. Барысава Фаіна ЯНУШЭЎСКАЯ.**— Раней на матэматыку адводзіліся 6 гадзін у тыдзень, затым 5, а цяпер 4. Гэта значыць, што практычна на кожным уроку вывучаецца новая тэма. Пасля правядзення кантрольнай на работу над памылкамі часу не прадугледжана. Вучні вымушаны ў паскораным тэмпе «ўбіраць» у сябе веды, бо на трывалае іх засваенне і замацаванне матэрыялаў часу ў праграме няма.

— Па матэматыцы ў нас на 245 гадзін менш, чым у Расіі. А гэта, між іншым, базавы прадмет для жыцця ўвогуле,— падкрэсліў Анатоль Тозік.— У нас жа як атрымалася: калі пераходзілі на 12-годку, вызвалілі ад урокаў суботу. А калі вярнуліся да 11-гадовай сярэдняй школы, суботы так і засталіся свабоднымі ад урокаў. Мы кажам, што нашы дзеці перагружаны, і прыбіраем са школьнай праграмы такі важны прадмет, як «Айчынная і сусветная мастацкая культура». А сёння назіраем, як імкліва зніжаецца агульны ўзровень культуры маладых людзей… Мяркую, што трэба вярнуць у школу гэты прадмет.

ВУЧЭБНАЯ СУБОТА?

Васіль Будкевіч лічыць, што неабходна перагледзець тыпавы план агульнай сярэдняй адукацыі і павялічыць колькасць гадзін на вывучэнне матэматыкі і прадметаў прыродазнаўча-навуковага цыкла. Але за кошт чаго можна гэта зрабіць, калі не задзейнічаць суботу і не падаўжаць навучальны год? Анатоль Тозік пацікавіўся меркаваннем педагогаў наконт мэтазгоднасці скарачэння летніх канікул:

— Не ўсім спадабаецца, што я скажу, але ў нашай краіне вельмі кароткі навучальны год — 165 дзён. У еўрапейскіх краінах школьнікі вучацца на працягу года 230 дзён, у краінах Паўднёва-Усходняй Азіі — 230–265 дзён. Між іншым у большасці гэтых краін — 12-гадовая сярэдняя адукацыя і нават 13-гадовая. Калі ў краінах Паўднёва-Усходняй Азіі на працягу ўсіх гадоў навучання ў школе дзеці вучацца 3120 дзён, то ў Беларусі — 1815. Амаль удвая менш! Акрамя таго, у нас дзейнічае яшчэ і абмежаванне на колькасць урокаў…

На думку педагогаў, задзейнічаць пад вучобу першы летні месяц наўрад ці атрымаецца. Прычын шмат: правядзенне аздараўленчай кампаніі, 56-дзённы водпуск у педагогаў, неабходнасць падрыхтаваць да новага навучальнага года школу і кабінеты… А вось вяртанне суботы ў школьны расклад многія расцэньваюць станоўча. Свабодную ад урокаў суботу прапануецца пакінуць толькі ў пачатковай школе і для вучняў 5-х класаў, паколькі гэта год адаптацыі малодшых школьнікаў да новых патрабаванняў.

СТАРШАЯ ШКОЛА — НЕ ДЛЯ КОЖНАГА

Яшчэ адзін дыскусійны момант — увядзенне парога пры адборы вучняў у старшую школу.

— Па выніках рэспубліканскага маніторынгу, 77% педагогаў і 65% бацькоў лічаць магчымым увядзенне абмежаванняў пры прыёме навучэнцаў у 10-ы клас,— паведаміла **дырэктар Нацыянальнага інстытута адукацыі Раіса СІДАРЭНКА.**— Пераход да наступнай ступені адукацыі мэтазгодна рабіць на аснове незалежнай выніковай атэстацыі. Да падобнай практыкі паступова пераходзяць у суседніх дзяржавах. У прыватнасці, у Расійскай Федэрацыі ўводзіцца абавязковая дзяржаўная выніковая атэстацыя дзевяцікласнікаў, якая ажыццяўляецца на незалежнай аснове.

У цяперашніх выпускных экзаменах за курс базавай школы, якія праводзяць «свае» настаўнікі, ніхто сэнсу не бачыць. Але ёсць і іншая прапанова — дапускаць у 10-ы клас вучняў згодна з сярэднім балам пасведчання аб агульнай базавай адукацыі. Сярэдні бал пасведчання павінен быць не ніжэй за 6 балаў, а адзнакі па профільных дысцыплінах — не ніжэй за 7 балаў.

Узнікла пытанне: як быць у такім разе з гімназістамі, якія ўжо здавалі іспыты пры паступленні ў гімназію? Ці арганізоўваць для іх дадатковы допуск у 10-ы клас?

— Няма ніякай гарантыі, што вучань, які добра вучыўся ў 5-м класе, будзе таксама добра вучыцца і ў 9-м,— падзялілася сваімі думкамі **настаўніца біялогіі Смаргонскай гімназіі, пераможца Рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года —2006» Ірына КЛЯВЕЦ.**— Калі мы кажам пра трэцюю ступень як пра акадэмічную, як пра падрыхтоўку да навучання ў ВНУ, то на старшую ступень гімназіі павінны трапляць толькі тыя вучні, якія здольны працаваць і засвойваць яе праграму. Па маіх назіраннях, гэта прыкладна 50 працэнтаў. Астатнія 50 працэнтаў гімназістаў педагогі спрабуюць штучна падцягнуць і паставіць ім тую адзнаку, якую хацела б бачыць адміністрацыя. Адміністрацыя і аддзел адукацыі зацікаўлены ў тым, каб быў нейкі прыстойны сярэдні бал, а заложнікам сітуацыі аказваецца педагог. Калі вучань ведае на «5», а атрымлівае «7», то гэта яго вельмі разбэшчвае і прыніжае настаўніка, які хацеў бы ацэньваць адэкватна.

У выніку ў нас складваецца заганная сістэма: да 11-га класа мы атрымліваем прыстойны ўмоўны сярэдні бал, але затым нашы вучні спрабуюць здаваць ЦТ, атрымліваюць мінімальны бал і ідуць з гэтым балам у ВНУ.

АДЗНАКІ ЗАМЕСТ «ЗОРАЧАК»

Пераход на профільнае навучанне на старшай ступені школы — гэта ўжо, так бы мовіць, вырашанае пытанне. Нацыянальны інстытут адукацыі прапануе чатыры профілі: гуманітарны, прыродазнаўча-навуковы, сацыякультурны і тэхніка-тэхналагічны. Да слова, больш за палову апытаных бацькоў і педагогаў (54% і 56% адпаведна) падзяляюць думку пра тое, што профільнае навучанне ў старшых класах можа стаць альтэрнатывай рэпетытарству.

Раіса Сідарэнка звярнула ўвагу на тое, што перш чым пераходзіць на профільнае навучанне, кожнай навучальнай ўстанове трэба дасканала прааналізаваць, ці могуць там быць забяспечаны ўмовы для гэтага. У першую чаргу — наяўнасць высокапрафесійных педагагічных кадраў, здольных рэалізоўваць праграму профільнага навучання, сучасная вучэбна-матэрыяльная база, вучэбна-метадычнае суправаджэнне. Натуральна, што на пераходным этапе агульнаадукацыйныя класы захаваюцца.

На пасяджэнні рабочай групы было ўзнята і пытанне безадзнакавага навучання ў пачатковай школе. Амаль усе прысутныя сышліся ў меркаванні, што адзнакі трэба вяртаць.

Наша бяда ўжо нават не ў тым, што дзеці не могуць ці не жадаюць размаўляць на беларускай мове. Сітуацыя нашмат горшая: яны ўжо страцілі здольнасць да беларускага вымаўлення.

— Без выстаўлення адзнакі ў дзённік цяжка растлумачыць бацькам, на якім узроўні развіцця знаходзіцца іх дзіця. Акрамя таго, пры безадзнакавым навучанні дакументацыя для вядзення настаўнікамі павялічваецца на парадак. Акрамя класнага журнала, настаўнік запаўняе яшчэ адзін журнал сістэматычнага ўліку ведаў, уменняў і навыкаў,— кажа **настаўніца пачатковых класаў Барысаўскай сярэдняй школы № 20 Святлана БЯЛОЦКАЯ.**— Я лічу, што адсутнасць адзнакі па выяўленчым мастацтве, працоўным навучанні, фізічнай культуры, музыцы зніжае ў дзіцяці імкненне прыкласці намаганні для дасягнення выніку навучання, губляецца інтарэс да прадмета. Мэтазгодна было б выкарыстоўваць безадзнакавае навучанне толькі ў першым класе, а з другога класа выкарыстоўваць адзнакі.

ПРАБЛЕМА ДЛЯ ВЫРАШЭННЯ

Анатоль Тозік выказаў заклапочанасць станам беларускай мовы ў нашых школах:

— Мяркую, гэта дастаткова сур'ёзная праблема. Пойдзе беларуская мова са школы — яна пойдзе і з нацыі. І нацыя пераўтворыцца ў насельніцтва. Апошнім часам на гэта некалькі разоў звяртаў увагу і кіраўнік дзяржавы. Я лічу, што трэба абавязкова здаваць і беларускую, і рускую мову, а не прадастаўляць выпускнікам і абітурыентам выбар, як гэта робіцца зараз. Магчымасць выбару якраз і прывяла да таго, што на ЦТ беларускую мову ў апошні год здавалі толькі 15% ад агульнай колькасці абітурыентаў. Калі так пойдзе і далей, то Беларусь можа аказацца нацыяй, якая добраахвотна адмовілася ад нацыянальнай мовы і страціла яе. А як можна зразумець, што гісторыя Беларусі выкладаецца ў нас на рускай мове? Я лічу, што грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які мае сярэднюю і базавую адукацыю, павінен валодаць дзвюма дзяржаўнымі мовамі ў роўнай ступені. Трэба ліквідаваць раздзяленне школ на беларускамоўныя і рускамоўныя. Гэта ўсё нашы беларускія школы, таму там павінны прысутнічаць у роўнай ступені і беларуская, і руская мовы. Наша бяда ўжо нават не ў тым, што дзеці не могуць ці не жадаюць размаўляць на беларускай мове. Сітуацыя нашмат горшая: яны ўжо страцілі здольнасць да беларускага вымаўлення, якая закладваецца ў раннім дзяцінстве. Яны не чуюць беларускай мовы…

На пасяджэнні прагучала думка, што беларуская мова стала для многіх амаль што замежнай, таму падыходзіць да яе выкладання трэба як да выкладання замежнай мовы і дзяліць у пачатковай школе класы на меншыя групы. А беларускамоўнае асяроддзе трэба стварацьяшчэ ў дашкольных установах адукацыі.

— Для пашырэння сферы выкарыстання беларускай мовы ў адукацыйным працэсе трэба забяспечыць выкладанне гісторыі Беларусі і геаграфіі Беларусі на беларускай мове,— прапанаваў Васіль Будкевіч.— Забяспечыць падрыхтоўку і выданне інструктыўна-метадычных лістоў, каляндарна-тэматычнае планаванне па кожным з гэтых вучэбных прадметаў, контурных карт і атласаў, рабочых сшыткаў на дзвюх дзяржаўных мовах — беларускай і рускай. І, галоўнае, забяспечыць вывучэнне беларускай і рускай моў у пачатковай школе ў роўным аб'ёме вучэбных гадзін.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Мінск — Барысаў — Мінск

Якія яшчэ прапановы прагучалі на пасяджэнні рабочай групы:

— зрабіць дырэктараў установ адукацыі дзяржаўнымі служачымі;

— увесці льготнае крэдытаванне будаўніцтва жылля для педагогаў або ўвесці для педагогаў ільготную іпатэку (у Расіі практыкуецца іпатэка для педагогаў тэрмінам на 10 гадоў, што дазваляе ўтрымаць у галіне спецыялістаў);

— выдзяляць для педагогаў ільготныя пуцёўкі для санаторна-курортнага аздараўлення хоць бы раз на тры гады;

— павялічыць аплату класнага кіраўніцтва да паловы стаўкі;

— павялічыць аплату за праверку сшыткаў і дыферэнцыяваць яе ў залежнасці ад напаўняльнасці класа (зараз аплачваюцца максімум 2 гадзіны такой работы ў тыдзень; такім чынам, на праверку аднаго сшытка настаўніку даецца ад 25 да 40 секунд);

— устанавіць парогавы бал для залічэння ў гімназію — не менш як 45;

— праводзіць конкурс на вакантныя месцы педагогаў у гімназіі;

— перагледзець змест лепшых савецкіх падручнікаў на прадмет іх адаптацыі да сучасных умоў.

ВЫХОЎВАЦЬ МОЛАДЗЬ — СПРАВА ГРАМАДСКІХ АБ'ЯДНАННЯЎ

На мінулым тыдні ў Валожынскім раёне праходзіла выязное пасяджэнне Мінскага абласнога каардынацыйнага савета грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый. Актывісты абмяркоўвалі сумесную працу па патрыятычным, працоўным і духоўным выхаванні моладзі напярэдадні святкавання 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, а таксама рэалізацыю Дэкрэта Прэзідэнта «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у нядобранадзейных сем'ях».

На працягу дня члены каардынацыйнага савета наведалі дзіцячы сад — сярэднюю школу ў аграгарадку Доры, аналагічную ўстанову ў аграгарадку Пяршаі, аддзяленне сацыяльнага прытулку ва ўстанове адукацыі «Валожынскі дзяржаўны раённы сацыяльна-педагагічны цэнтр», а таксама Валожынскі прафесійны сельскагаспадарчы ліцэй. Пасля адзначаных мерапрыемстваў адбылося пленарнае пасяджэнне арганізацыі. Удзел у ім прыняў **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама Руслан ТРУХАН:**

— Наш каардынацыйны савет — гэта пляцоўка для абмеркаванняў і дыскусій. Звяртаюся да прадстаўнікоў партый і грамадскіх аб'яднанняў: выкарыстоўвайце гэтую пляцоўку больш актыўна, выносьце на парадак дня важныя для вашай арганізацыі і нашага народа пытанні, працуйце ў як мага большым спектры праблем. Расказвайце пра сваю працу людзям: яны павінны ведаць, чым вы займаецеся. Таксама заклікаю вас працаваць на апярэджанне. Ужо сёння трэба рыхтавацца да мерапрыемстваў па святкаванні 70-годдзя Перамогі. Удзельнікаў той вайны з кожным годам становіцца ўсё менш і менш, і сёлета святочныя мерапрыемствы пройдуць пад дэвізам «Ніводнага ветэрана без увагі». Нагадваю, што ў хуткім часе ўсіх нас чакае своеасаблівы палітычны экзамен — выбары Прэзідэнта краіны, якія, хутчэй за ўсё, пройдуць у верасні наступнага года. Фарміраванне выбарчых камісій усіх узроўняў, агітацыйных груп, камісій па наглядзе за выбарамі — прамая задача арганізацый, якія ўваходзяць у каардынацыйны савет, і гэтую працу распачынаць таксама трэба сёння.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

МАЛІТВЫ ДЛЯ МАМЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Яна гэтыя прапановы нават слухаць не стала, вырашыўшы пазмагацца за родную крывіначку — і цяпер, праз 5 гадоў упартай барацьбы, лячэння і кансультацый, некалькіх складаных аперацый і штодзённай напружанай працы з гонарам зазначае, што амаль усе гэтыя дыягназы з сына зняты. Засталося толькі парушэнне слыху — давялося ставіць капілярны імплантант, бо раней малы наогул нічога не чуў. Але сёння спецыялісты абнадзейваюць, што ў перспектыве хлопчык зможа пайсці ў звычайную школу і паспяхова кантактаваць з аднагодкамі. «Тым больш, старэйшыя брат і сястрычка ва ўсім малодшаму дапамагаюць, ён ловіць кожнае іх слова і відавочна развіваецца»,— са светлай усмешкай дзеліцца мама Алена.

…Матуліна свята ў Заслаўі пачалося з літургіі, якую ў гонар усіх маці правёў у Спаса-Праабражэнскай царкве айцец Павел. І, безумоўна, галоўныя просьбы жанчын-прыхаджанак у гэты дзень датычыліся здароўя іх дзяцей, незалежна ад таго, маленькія яны ці ўжо дарослыя.

А крыху пазней, пасля экскурсіі па адметных мясцінах Заслаўя і прагулкі па надзвычай прыгожым парку з найсучаснымі дзіцячымі гульнявымі комплексамі (ён з'явіўся і быў добраўпарадкаваны сёлета да Дня пісьменства) пажаданні здароўя, шчасця і дабрабыту, кветкі і творчыя прызнанні ў любові прымалі ўжо самі матулі. І хоць яны не з тых, хто паказвае эмоцыі на публіцы, цёплыя словы і віншаванні ад намесніка старшыні Беларускага саюза жанчын Антаніны Моравай іх відавочна расчулілі. Дый падарункі ад спонсараў мерапрыемства, сярод якіх — вядучыя беларускія вытворцы касметыкі, кандытарскіх вырабаў, пасцельнай бялізны і іншай прадукцыі, безумоўна, прыйшліся дарэчы кожнай вялікай сям'і. А падчас святочнага канцэрта «Матуля родная — выток жыцця, калыска дабрыні», калі выконвалі жэставую песню дзяўчаткі са школы-інтэрната для дзяцей з парушэннямі слыху,— многія мамы наогул ледзь стрымлівалі слёзы.

Падчас свята адбылася і яшчэ адна знакавая падзея — ушанаванне пераможцаў Рэспубліканскага творчага конкурсу «Моцная сям'я — моцная дзяржава», які ўжо ў трэці раз правялі сумесна Міністэрства інфармацыі Беларусі і Беларускі саюз жанчын. Што асабліва прыемна, у ліку яго пераможцаў аказалася і «Звязда».

— Тэма сям'і павінна стаць адной з галоўных на старонках друкаваных рэспубліканскіх і рэгіянальных выданняў, у тэле- і радыёпраграмах, бо моцная сям'я — гэта той фундамент, з якога пачынаецца закладка базавых каштоўнасцяў у кожным чалавеку. Мне прыемна адзначыць, што сёння журналісты шукаюць для сваіх артыкулаў вельмі цікавыя сем'і,— падзялілася сваімі ўражаннямі ад сёлетніх конкурсных работ **міністр інфармацыі Беларусі Лілія АНАНІЧ.**— Магчыма, дзякуючы таму, што ў апошнія гады дзяржава шмат зрабіла для ўмацавання сям'і ў рамках праграмы дэмаграфічнай бяспекі. Мы хоць пакрысе, але пачынаем прырастаць, і з кожным годам маленькіх беларусаў нараджаецца ўсё больш. Вельмі важна ў прэсе падтрымліваць гэты настрой на жыццё, па-добраму фарміраваць культ сям'і, культ маральных каштоўнасцяў. Такая інфармацыйная палітыка павінна быць не разавай, прымеркаванай да Дня маці або Дня абароны дзяцей, а сістэмнай і грунтоўнай. Гэтую добрую, пазітыўную ноту трэба штодня ўплятаць у агульную інфармацыйную плынь.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

■ Запрашальнік

«Паўночны вектар Гродзеншчыны — 2014»

24 кастрычніка ў Смаргоні адбудуцца ўжо традыцыйная, пятая рэгіянальная выстава-кірмаш «Паўночны вектар Гродзеншчыны-2014» і міжнародны эканамічны форум «Новыя магчымасці і перспектывы супрацоўніцтва».

Паўночны рэгіён Гродзеншчыны ўключае ў сябе тры раёны — Ашмянскі, Астравецкі і Смаргонскі агульнай плошчай 4,3 тысячы квадратных кіламетраў, дзе пражывае больш за 115 тысяч чалавек. Сумесная выстава дапамагае суседзям паглыбляць і развіваць міжрэгіянальныя кантакты — найперш у сферы прамысловасці і прадпрымальніцтва (з дэманстрацыяй і продажам новых відаў прадукцыі), а таксама культурныя, гуманітарныя.

Сёлетняя выстава збярэ ў Смаргоні больш за 60 арганізацый трох раёнаў, у тым ліку з замежным капіталам, прадстаўнікоў малога і сярэдняга бізнесу. Запрошаны дыпламаты, прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў, абласных і раённых улад. Будуць прадстаўлены прапановы па наладжванні і развіцці гандлёва-эканамічных сувязяў, нарошчванні беларускага экспарту, а таксама канкрэтныя праекты з перспектывай прыцягнення замежных інвестыцый. Гэтыя пытанні абмяркуюць удзельнікі міжнароднага эканамічнага форуму. Акрамя таго, будуць прэзентаваны турыстычныя паслугі, падрыхтаваны цікавыя культурныя імпрэзы.

Для ўдзелу ў выставе-кірмашы ў якасці экспанента неабходна зарэгістравацца на сайце Гродзенскага аддзялення Беларускай гандлёва-прамысловай палаты, а для ўдзелу ў інвестыцыйным форуме — накіраваць заяўку ў вольнай форме па электроннай пошце на адрас: economsmorgon@mail.ru.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■ На слыху

РЭЗКАГА ПАДАРАЖАННЯ «КАМУНАЛКІ» НЕ БУДЗЕ

Затое адбудзецца планамернае павышэнне якасці паслуг і зніжэнне іх сабекошту. Аб гэтым паведаміў начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Мінжылкамгаса Андрэй РАМАШКА.

«Калі казаць пра тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі, то заканадаўствам устаноўлена абмежаванне пры штогадовым іх росце ў межах пяці долараў у эквіваленце з наступнай індэксацыяй адпаведна росту намінальных заработных плат,— нагадаў Андрэй Рамашка.— Таму рэзкага павышэння тарыфаў на паслугі не прадбачыцца».

Пры гэтым, каб знізіць нагрузку на бюджэт, цяпер існуе дыферэнцыраваная аплата (напрыклад, за ваду, электраэнергію) і пакуль усталяваныя нормы пераглядаць не плануецца. Аднак калі насельніцтва стане цалкам аплачваць камунальныя паслугі, ад дыферэнцыраванай аплаты адмовяцца, сказаў **начальнік упраўлення энергетыкі і навукова-тэхнічнага развіцця Мінжылкамгаса Вячаслаў ШМІТ.** Цяпер беларусы аплачваюць за паслугі каля 30% іх кошту, а да канца года гэтую лічбу плануюць павялічыць да 35%, спрагназаваў Андрэй Рамашка.

Гаворачы пра гатоўнасць сістэмы ЖКГ да ацяпляльнага сезона, спецыяліст адзначыў, што тарыф за цеплаэнергію для насельніцтва сёлета складае 90 тысяч рублёў за адну спажытую гігакалорыю. Як правіла, у двух- і трохпакаёвых жылых памяшканнях спажываецца да 1 ГКал за месяц.

Дарэчы, нягледзячы на цёплую восень, ва ўсіх сацыяльных і культурных установах краіны ацяпленне ўжо ўключана. На мінулым тыдні цяпло стала паступаць у жылфонд Віцебскай, Магілёўскай абласцей і часткова горада Мінска. Аднак паколькі ў апошнія дні тэмпература паветра перавышала 10 градусаў, далейшае ўключэнне спынілі і адновяць толькі тады, калі паветра на працягу пяці дзён будзе прагравацца максімум да 8 градусаў. У тых рэгіёнах, дзе сістэму паспелі запусціць, яе не адключалі, а перавялі ў рэжым пратаплівання.

Спецыялісты таксама паведамілі, што для забеспячэння бесперабойнай работы сістэмы ацяплення жылфонду і ліквідацыі аварый створаны рэзервовыя матэрыяльныя рэсурсы — помпы, трубы, радыятары ацяплення і інш.

Ужо атрыманы пашпарты і акты гатоўнасці на ўвесь жылфонд краіны, падсумавалі прадстаўнікі міністэрства.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

■ Да ведама

ЗІМОВЫ ЧАС СКАРЭКЦІРАВАЎ РАСКЛАД РУХУ ЦЯГНІКОЎ

Беларуская чыгунка ўнесла карэктывы ў расклад руху міжнародных цягнікоў у сувязі з пераходам Расіі, Украіны і краін ЕС на «зімовы» час.

Як распавялі ў прэс-службе БЧ, у сувязі з пераходам на яго ў ноч з 25 на 26 кастрычніка ў суседніх краінах Беларуская чыгунка разам з іх чыгуначнымі адміністрацыямі загадзя правяла карэкціроўку руху міжнародных цягнікоў.

Напрыклад, цягнік № 2 Мінск — Масква, які зараз адпраўляецца з Мінска ў 21.30 і прыбывае ў Маскву ў 8.05, з 26 кастрычніка будзе адпраўляцца з нашай сталіцы ў 22.06 (час прыбыцця застаецца без змяненняў). Цягнік № 1 Масква — Мінск з пераходам на зімовы час будзе адпраўляцца з расійскай сталіцы ў 21.25 (зараз ён адпраўляецца ў 22.25) і прыбываць у Мінск згодна з ранейшым раскладам — у 7.35.

Цягнік № 86 Мінск — Кіеў, які выходзіць з нашай сталіцы ў 21.56 і прыбывае ў Кіеў у 7.51, з 26 кастрычніка будзе адпраўляцца з Мінска ў 22.45 (час прыбыцця ў Кіеў — без змяненняў). З пераходам на зімовы час у зваротным напрамку цягнік будзе выходзіць з Кіева ў 21.19 (да 26 кастрычніка адпраўляецца ў 22.25), час прыбыцця ў сталіцу Беларусі застаецца без змяненняў — 8.25.

Цягнік № 805 Мінск — Вільнюс пасля пераходу на зімовы час будзе адпраўляцца з Мінска ў 8.40 (зараз — у 7.40) і прыбываць у канцавы пункт згодна з ранейшым раскладам — у 10.10. Час адпраўлення цягніка № 806 Вільнюс — Мінск пасля 26 кастрычніка застаецца нязменным — 18.14, але прыбываць у нашу сталіцу цягнік будзе на гадзіну пазней — у 21.44 (зараз — у 20.44).

Пасля 26 кастрычніка зменіцца расклад руху цягніка № 87 Мінск — Рыга: замест 21.30 састаў будзе адпраўляцца з Мінска ў 22.35 (час прыбыцця ў Рыгу застаецца ранейшым — 9.30), у зваротным напрамку цягнік будзе выходзіць з Рыгі па-ранейшаму ў 18.35, але прыбываць у Мінск ён будзе ў 7.46 (зараз — у 6.35).

Цягнік № 115 Мінск — Варшава, які выходзіць з Мінска ў 20.44 і прыбывае на станцыю Варшава-Заходняя ў 5.55, пасля пераходу на зімовы час будзе адпраўляцца з Мінска ў 21.45 (час прыбыцця застаецца без змяненняў). Цягнік № 116 Варшава — Мінск будзе выходзіць з Варшавы згодна з ранейшым раскладам у 20.52 і прыбываць у Мінск у 9.26 (зараз — у 8.38).

Пасля пераходу на зімовы час зменіцца час адпраўлення і прыбыцця і некаторых іншых цягнікоў міжнародных зносін. Апроч таго, у сувязі са зменамі ў графіку руху міжнародных цягнікоў скарэкціраваны і расклад цягнікоў рэгіянальных і міжрэгіянальных ліній, што курсіруюць па тэрыторыі краіны. Таму, выпраўляючыся ў дарогу, загадзя зазірніце ў расклад.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

РАЗАМ ЗРАБІЛІ ЛЯСЫ ЧЫСЦЕЙШАМІ

У акцыі «Чысты лес», якая па ініцыятыве Міністэрства лясной гаспадаркі прайшла 11 кастрычніка, узялі ўдзел амаль 30 тысяч чалавек. Агульнымі намаганнямі было сабрана і вывезена больш за тры тысячы кубаметраў смецця.

Сёлета асаблівая ўвага надавалася навядзенню парадку на землях ляснога фонду, размешчаных уздоўж аўтамагістраляў. Ачышчаліся прыдарожныя палосы ўздоўж усіх аўтамабільных дарог рэспубліканскага і абласнога значэння. Акрамя таго, добраахвотнікі не абышлі ўвагай месцы складзіравання драўніны, а таксама месцы адпачынку і іншыя аб'екты сацыяльнага значэння, размешчаныя ўздоўж дарог. Традыцыйна акцыю падтрымалі супрацоўнікі шматлікіх арганізацый, а таксама навучэнцы школ і каледжаў, студэнты і ўладальнікі дачных участкаў садаводчых таварыстваў.

Акцыя «Чысты лес» прайшла ўжо ў пяты раз. Колькасць удзельнікаў павялічваецца з кожным годам. З 2010 года ў ёй узялі ўдзел амаль 90 тысяч добраахвотнікаў.

«РЫБАЛКА» НА 115 МЛН І КРЫМІНАЛЬНАЯ СПРАВА

Дзёрзкага браканьера з буйным уловам затрымалі супрацоўнікі Мядзельскай міжрайінспекцыі на Вілейскім вадасховішчы. Жыхар пасёлка Плешчаніцы за ноч налавіў столькі рыбы, што тая ледзьве змясцілася ў гумавай лодцы.

— Мужчына здабыў 70 судакоў, 100 ляшчоў і яшчэ 38 асобін іншых відаў рыбы. Гэты ўлоў стаў магчымым дзякуючы васьмі сеткам агульнай даўжынёй каля паўкіламетра. Вага незаконнай здабычы склала 136 кілаграмаў,— распавяла **прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга ГРАМОВІЧ.**— Браканьер так захапіўся «працай», што нават не заўважыў, як у цемры да яго падплыла лодка з супрацоўнікамі міжрайінспекцыі. Як высветлілася, мужчыну ўжо неаднойчы затрымлівалі за незаконнае рыбалоўства. Крымінальная справа заведзена і зараз. А для пачатку парушальніку давядзецца пакрыць каля 115 мільёнаў рублёў шкоды, нанесенай прыродным рэсурсам.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Запрашальнік

Археалагічны пікнік у Радзівілаў

У гэту суботу, 18 кастрычніка, ёсць добрая магчымасць пашукаць... скарб Радзівілаў. У музеі-запаведніку «Нясвіж» вам у гэтым дапамогуць і нават навядуць на след схаваных калісьці багацяў...

Пра тое, што дзесьці на тэрыторыі палаца могуць быць яшчэ не знойдзеныя каштоўнасці, паведаміла ўнучка апошняга нясвіжскага ардыната Лявона Радзівіла Дзіяна Радзівіл-Караба, якая гэтым летам упершыню наведала палац разам са сваёй сям'ёй. Шмат размоў вялося як пра яе дзеда, так і пра тое, што з'язджаючы, Радзівілы многае забралі з сабой, аднак штосьці ўсё ж пакінулі ў сваіх уладаннях. Высветліць, што ж гэта такое, ёсць магчымасць ва ўсіх, хто захоча далучыцца да археалагічнага пікніка. Кіраваць пошукам скарбаў будуць супрацоўнікі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Тым, хто наведае замак у гэты дзень, будзе прапанавана таксама і забаўляльная праграма. Гэта майстар-клас і музыка ад дуэта акардэаністаў BierStrasse, баварскія танцы ў выкананні тэатра «Яварына». Завершыцца ўсё канцэртам джазавай музыкі ў выкананні квартэта саксафаністаў SaXaS і джаз-бэнда JuicyJazz. За дадатковую плату гасцей чакаюць напоі, гарачыя закускі і іншая смаката, прыгатаваныя ў рэстаране палаца. Распачнецца дзея ў 12.00, завершыцца ў 17.00. Кошт уваходнага квітка — 30 тысяч.

Намеснік дырэктара музея-запаведніка «Нясвіж» Наталля ЖАРКО расказала, што працоўная назва гэтага мерапрыемства — Oktoberfest. Бо плануецца, што фестываль стане традыцыйным: будзе ладзіцца кожны кастрычнік, аднак па розных тэмах, звязаных з легендамі, месцамі, асобамі радзівілаўскай вотчыны.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ

■ Была. Ёсць. Будзе?

САКРЭТНАЯ МОВА КАПЫЛЬСКІХ МЯШЧАН

Так, гэта была менавіта кравецкая мова! Ні шаўцы, ні ганчары, ні гарбары, ні бондары, ні яўрэі, якія гандлявалі ці шылі адзенне, ці займаліся іншым рамяством, ні татары, якіх было многа ў Капылі з сярэдніх вякоў аж да нашых дзён, не мелі да гэтага жаргону ніякага дачынення. Гэта была сакрэтная мова капыльскіх мяшчан.

Стварылі «кравецкую мову», размаўлялі на ёй — краўцы. Людзі (наогул мужчыны), якія шылі кажухі і другую вопратку. Але найбольш — кажухі. Гэта цяпер у нас глабальнае пацяпленне. А раней, да 60-х гадоў XX стагоддзя зімы былі суровыя, з маразамі пад 40° (як у зіму 1939—1940 гадоў, калі ў нас павымярзалі сады). З мяцеліцамі, што замяталі снегам нават вокны хат і дзверы, што раніцай немагчыма было адчыніць. А на вуліцы былі такія гуры (сумёты, горы снегу), што дзеці (і я таксама) каталіся з іх на лыжах і на санках, слізгалі ў гумовых галошах (іх клеілі з аўтамабільных камер), ды проста коўзаліся «на сраках». Прабачце за гэта чыста беларускае слова.

Але вернемся да краўцоў.

Яны пешшу хадзілі па вёсках, насілі з сабой швейныя машыны і ў чыёй-небудзь хаце шылі кажухі з авечых аўчын, гэты значыць, выбраных авечых шкур.

Гаспадар ці гаспадыня давалі краўцам аўчыны, кармілі іх, на ноч сцялілі ім пасцель на падлозе (бо ўсе ложкі былі заняты: у хаце жылі і малыя, і сталыя, і старыя, нават на печы нехта спаў).

А краўцы, як развіднее (бо электрычнага святла не было) шылі кажухі.

О, кажухі! Каб не вы, наўрад ці выжылі б беларусы (нават ліцвіны, калі гістарычна).

Не апранеш кажух — замерзнеш!

А так сядзеш у доўгім кажуху ў санях, ногі ім накрыеш і едзеш.

Так я ездзіў у дзяцінстве і юнацтве ў лес па дровы, у госці да цёткі Тоні ў Бадзяжы. А нашы прадзеды так ездзілі і па справах, і ў госці — самагонку піць.

Дык вось ліцвінаў, а потым і беларусаў абагравалі авечыя кажухі.

Сядзяць краўцы ў хаце селяніна і шыюць яму ці яго дачцэ, жонцы кажух ці аздоблены фанабэрысты кажушок. Нешта пагавораць між сабою на незнаёмай мове, а потым і кажуць гаспадару: «Братка, не хапае на рукаў!». А перад гэтым адзін аднаму сказаў: «Кашуба пашывайка» — гэта на кравецкай мове «Не хапае на рукаў». А гаспадар, замілаваны тою заліхвацкаю кравецкаю працай і ўжо ў марах убачыўшы сябе і жонку ў новенькіх мадняцкіх кажухах, бяжыць у камору і нясе адтуль яшчэ адну вялікую аўчыну. Бо малых у яго не было!



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

А хітрыя капыльскія краўцы (хітрэйшых у Беларусі не было) бяруць тую дадатковую аўчыну і, калі гаспадар пакіне іх адных, кладуць аўчыну ў свой вялізны мех. А рукаў?.. Рукаў яны даўно ўжо робяць з кускоў, на рукаў і так добра будзе.

І гаспадар радуецца абнове, і краўцы радуюцца. Цэлую аўчыну змахлявалі. Так з сялян па аўчыне — краўцу кажух.

Вось дзеля чаго і стваралася кравецкая капыльская мова — каб ашукваць сялян з навакольных вёсак.

Потым ужо мовай краўцоў сталі карыстацца і шаўцы ботаў, і яўрэі, і татары, — наогул, капыляне.

Калі я быў у хаце мудрай капыльскай мяшчанкі Тані Куліковіч (дзявочае прозвішча), цяпер Таццяны Аляксандраўны Бурак, мяне вельмі здзівіла і насмяшыла, як яна ўтойвала ад мужа (бо ён — «дзярэўня») нашу размову, размову дваіх капыльскіх мяшчан. І я вельмі ёй за гэта ўдзячны: яна прыняла мяне ў мяшчане, а гэта — гонар! Не кожнага прымуць карэнныя капыляне, мяшчане ў свае рады. Мабыць, я заслужыў гэтую павагу ў народа, і вельмі гэтаму рад. Трэба было не толькі заслужыць, але і пражыць у Капылі не меней за дваццаць пяць гадоў. А я ўжо жыву і працую ў Капылі 45 гадоў...

А як вам падабаецца такое? «Не зюкай пры ірпытцы» — перакладаецца з кравецкай мовы «Не гавары пры гэтай дурніцы». Як вам такая дыпламатыя? І нікога не крыўдзілі, ніхто не скардзіўся, бо нічога не разумелі.

А 200-300 гадоў таму разумнейшыя капыляне аддзялілі сябе ад сялян жаргонам. Таргуючы мех, бульбу, калі вясковец упарта стаяў на сваёй цане, капылянін з прыкрасцю ўсклікаў: «А каб ты віхлянку троіў!» ці бурчаў сабе пад нос: «Бетты (ці бецкі) лабур!». Казалі гэта з пагардай. Або адзін аднаму: «Бетты лабур, ніконта не знагчыць». Што азначала: «Вясковы (дзеравенскі) хлопец, нічога не разумее». А пра вясковую жанчыну «Бетта каруна, ніконта не знагчыць».

Магло дайсці і да кулачнай бойкі. Перад мардабоем капылянін гаварыў свайму сябру: «Шчас мы ему ўкрыем і пакнае да паркі цемошыць». Што азначала — «зараз мы яго адлупцуем і хай ідзе да жонкі дадому спаць».

Ну а калі торг ішоў добра і ўсе былі задаволены, магло дайсці і да такога: «Пакерым гардзі, крывуху і будзем баніць гардзею». А ў перакладзе з кравецкай на беларускую: «Давайце возьмем гаралкі, будзем піць і каўбасою закусваць». «Гардзі, гардзея» — гэта, напэўна, дзяржаўная гаралка. А самагонка ў кравецкай мове — «сівуха». А яшчэ гаралку звалі «гардзімаха».

«Парка» — азначала «жанчына». А «жонка» — «рахеля» (успомнім яўрэйскае «Рахіль»). Пра што часцей за ўсё гавораць пры сустрэчы? Калі няма пра што, то гавораць пра надвор'е. «Воліць укірыць дзяльбун», «зюкае» адна «парка» другой. На беларускай мове — «Мусіць, будзе дождж» (даслоўна — «хоча пайсці дождж»).

На базары селі перакусіць. А што ліцвін бярэ з сабой паесці? Ну, вядома, сала. Капыляне гаварылі (зюкалі) паміж сабою: «Бетты (ці бецкі) лабур троіць крэса». Што азначала: «Вясковы хлопец жарэ сала». Мы зноў на капыльскім базары. Кравец хоча хутчэй прадаць свой тавар, ну, напрыклад, жаночы кажушок. Прыглядваецца да магчымага пакупніка: «Каруля клёвая, але хапкоў не мае». Гэта азначала: «Жанчына што трэба, але грошай не мае» (хопкі, хопікі — грошы).

Паступова ад «службовага» ўжывання кравецкая мова становіцца бытавой. Выбыніўшы гардзі лабуры зюкалі: «Пак наем да паркі» — «Паедзем да дзяўчат».

Маглі сказаць: «Свааўкі пакнае да паркі» — «Я пайду дахаты».

Тым, хто хоча «пазюкаць», прапаную невялікі слоўнік.

Аляксандр КОРЗУН

Слоўнік беларуска-кравецкі

Авечка — блякотка
Вочы — зекры
Прыгожы — вакля
Выпіўка — чаус
Ежа — траянка
Грошы — стопікі, хопікі
Дождж — дзяльбун
Карова — рыкуха
Каўбаса — свісла
Ногі — хадаркі
Рукі — біркі
Шыя — хабаль
Сала — крэса
Галава — ёлда
Бульба — трацякі
Хлеб — цупік (цупчык)
Зубы — сякачы
Нос — сапач
Даць (аддаць) — адкірыць
Есці — троіць
Зарэзаць — укесаць
Ісці — кнаяць
Пагаварыць — пазюкаць
Паехаць — пахнаяць
Хацець — воліць
Стары — ёры
Дом — парка
Дзіця — сечка
Украў — інснуў

А гэта спіс капыльскіх мяшчан, якія зберагліі для нас кравецкую мову:

Пісьменнік Сцяпан Александровіч, Пятро Малевіч, ветэран вайны; Мікалай Малевіч, Надзея Пласкавіцкая (Гарбуз), Таццяна Бурак (Куліковіч), Клара Санкіна (Гурыновіч), Галіна Гурло, Валерый Алісевіч, Антон Балога, Леанід Шкілевіч, Леў Красуцкі, Анатоль Татарынчык, Уладзімір Місючэнка.

■ Ад першай асобы

Іван МЕЛЬНІКАЎ:

«Я БАЦЬКУ І ДЗЕДА СВАІХ НЕ ПОМНЮ...»

Гамяльчанін стварыў фотарадавод

У многіх з нас на шафах у бабуль пад слоем пылу або на самых далёкіх паліцах ляжаць альбомы са старымі фотаздымкамі. Мы захоўваем іх дзеля памяці і з-за павагі да сваякоў, але не вельмі часта праглядаем. У лепшым выпадку з роднымі сталага веку раз ці два пагарталі старонкі з «вушкамі», збольшага запомнілі твары сваякоў, якіх ніколі не даводзілася бачыць... А вось гамяльчанін Іван Мельнікаў іначай ставіцца да старых здымкаў. Ён не тое што пільна абгледзеў і высветліў асобы ўсіх сваякоў у сваіх альбомах, але і завітаў у госці да родных, азнаёміўся з іх калекцыямі здымкаў, адсканаваў і запісаў усё, што мог. Такім чынам мужчына стварыў фотарадавод сваёй сям'і.

Свае пошукі Іван Мельнікаў распачаў толькі тады, калі выйшаў на пенсію. Раней працаваў слесарам-зборшчыкам на машынабудаўніцтве, таксама аграншчыкам дыяментаў — кажа, што часу на радавод не меў. Ён фатограф-аматар ужо не ў першым пакаленні, верагодна, таму менавіта здымкі зацікавілі яго як спосаб стварэння гісторыі сям'і. Ён захоўвае іх дома ў каробках, таксама скануе ўсе выявы, якія трапляюць да яго, і вядзе электронны архіў.

Мельнікаў ніколі не бачыў ні свайго бацькі, ні дзядоў, ні бабуль — яны памерлі, калі ён быў зусім малым. Можа, недахоп іх любові і прысутнасці побач, неспатоленае жаданне бачыць твары родных людзей прымусілі гэтага чалавека збіраць іх фотавыявы. Пра ўсё расказаў сам Іван Цітавіч Мельнікаў:

— Я збіраю старыя фотаздымкі, якія захаваліся ад родных. Адных людзей на іх ведаю, іншых спрабую ўзнавіць. Звяртаюся да родных сталага веку, каб яны распавялі, хто на картачцы і дзе яна зроблена. Каб заняцца гэтым раней, калі былі жывыя людзі старэйшага пакалення, можна было б атрымаць нашмат больш інфармацыі.

Калісьці радаводныя запісы вяліся ў царкоўных кнігах — некаторыя з іх захаваліся. Таму і ўдалося скласці радавод маёй сям'і, нягледзячы на тое, што ўсе былі сялянамі, а не шляхцічамі. Аб прозвішчы майго бацькі выпушчана цэлая кніга — яе аўтары Смірнова і Буткоўская зрабілі за мяне значную частку працы. Удалося адшукаць родных да 1700 года. Аднак калі я знаходжу пэўную дадатковую інфармацыю, імкнуся папоўніць іх звесткі. Напрыклад, пра пэўнага чалавека там напісана, што ў яго было трое дзяцей, аднак я ведаю, што ён меў не трое, а чатырнаццаць дзяцей. Таму я шукаю звесткі пра ўсіх чатырнаццаць і перасылаю стваральнікам кнігі.

Я збіраю фотаздымкі абсалютна ўсіх сваіх родных, падпісваю імёны, даты нараджэння і смерці, калі гэта вядома. Чым займаліся, не пішу, бо ўсе яны рабілі сялянскую працу: аралі зямлю, вырошчвалі ўраджай, часам ткалі, займаліся бортніцтвам.

У архівы я яшчэ не хадзіў. Пакуль жывыя старыя, збіраю інфармацыю ў іх. Бо людзі сыходзяць, хутка і незаўважна, — калі-небудзь будзе позна з імі размаўляць. Каб я пачаў займацца гэтым раней, то нашмат больш змог бы даведацца ў старых людзей. Памятаю іх усіх яшчэ жывымі, як быў хлапчуком. Памятаю і шмат фотаздымкаў, якія віселі ў родных на сценах, яны таксама пазнікалі. Бо так да іх ставіліся: старыя памерлі, дом разабралі на дровы, а фотаздымкі выкінулі на вуліцу. Дождж прайшоў, яны размоклі, і больш нічога не засталося... Такім чынам многія здымкі, якія калісьці захоўваліся ў рамках пад шклом, былі страчаны.

Мне хацелася даведацца, кім былі мае бабуля і дзядуля, як іх хаця б звалі. Я даўно цікавіўся гэтым, але, пакуль хадзіў на працу, не меў магчымасці ўсё высветліць. А як выйшаў на пенсію, з'явіўся вольны час: можна некуды пайсці, паехаць і распытаць. Вядома, не ўсе мае родныя жывуць у адной вёсцы, многія раз'ехаліся: ёсць яны і ў Амерыцы, і на Далёкім Усходзе, і ў Сібіры — для таго, каб звязацца з іх прадстаўнікамі ўжо больш маладога пакалення, таксама патрэбен дадатковы час.

Па фотаздымках можна сабраць тры, максімум чатыры пакаленні. А вось больш даўнія выявы наўрад ці ўдасца знайсці — тады фатаграфія яшчэ была мала развіта. Прадстаўнікі багатых саслоўяў маглі наняць мастакоў, і тыя пісалі іх партрэты — аднак сяляне так не рабілі.

Мой бацька памёр, калі мне было два гады, таму я яго не памятаю і амаль нічога пра яго не ведаў. Дзякуючы старым фотаздымкам і подпісам на іх, я даведаўся, дзе ён бываў, дзе служыў і іншае.

Ваша бабуля яшчэ жывая? Вы засталі ў жывых і сваю прабабулю?! Вам вельмі пашанцавала (герой кажа гэта ў дачыненні да карэспандэнта «Звязды»). А я і дзеда свайго не бачыў, бо яго рэпрэсавалі ў 1937 годзе. І другога дзядулю і бабуль сваіх я не ведаю. Толькі на фотаздымках магу іх убачыць...

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.
Фота Надзеі БУЖАН і з архіва героя

Маці Івана Мельнікава Ульяна Макараўна Мельнікава, 1922 года нараджэння (злева), і яе сястра Марыя Макараўна Крацянок, 1937 года нараджэння. Фота зроблена прыблізна ў 1950 годзе.

Аляксей Васільевіч Мельнікаў (стаіць) — дзед Івана Мельнікава, год нараджэння пакуль невядомы.

Ірына Макараўна Крацянок (справа), цётка Івана Мельнікава. Побач з ёй жанчына па імені Еўдакія, якая памерла толькі сёлета ў больш чым 100-гадовым узросце.

БАЙКІ кухмістра ВЕРАШЧАКІ

Ад «д'ябальскага» да «шумлівага»

Кароткі нарыс гісторыі пеністага віна

Для імітацыі шампанскага вельмі прыдаваўся звычайны... бярозавік, якога ў нас заўсёды было ў дастатку. Дабаўляўся цукар, лімонная кіслата і дрожджы — і дзякуючы ферментацыі атрымліваўся прадукт, які мог сысці за шампанскае для тых, хто ніколі не спрабаваў арыгінала. Прынамсі, выбіваў коркі і насіў бутэлькі не горш за яго.

Дарэчы, сучасную бутэльку асаблівай «аэрадынамічнай» формы, з тоўстага і цёмнага шкла, якое ахоўвае напой ад сонечнага святла і супрацьстаіць высокаму ціску газу, вынайшаў толькі ў 1800 годзе аптэкар Францыа з Шалона.

Польскамоўныя кнігі па хатняй гаспадарцы, распаўсюджаныя ў нас у XIX стагоддзі, змяшчаюць нямала рэцэптаў імітацыі шампанскага з самай рознай сыравіны. Вось адзін з іх, датаваны 1846 годам, які прэтэндуе на атрыманне прадукту, які амаль не адрозніваецца ад арыгіналу:

«8 квартаў недарагога белага віна, 8 унцый перапаленай слановай косці, прамытай у гарачай вадзе, 4 фунты цукру, чвэрць фунта насення сельдэрэю, 1 унцыя паташу. Усё разам, змяшаўшы, давесці да кіпення і праварыць 2 хвіліны, а пасля астывання даліць паўфунта віннага спірту і працадзіць».

Мабыць, у наш час такая падробка, нават без уліку кошту працы, атрымалася б нашмат дарагэйшай за арыгінал. Але паўтара стагоддзя таму пеністыя віны сапраўды былі рэдкасцю, а сакрэтам іх вытворчасці валодалі толькі лічаныя вытворцы. З той жа эпохі паходзяць рэцэпты «шампанскага» з сыроваткі або абястлушчанага малака, хлебных сухароў, фруктовых і ягадных сокаў, якія не спрабавалі падмануць спажыўца наконт паходжання напою, але давалі яму сціплую радасць ад сузірання імклівых бурбалак і спаталення смагі... Некаторыя мясцовыя гатункі «шампанскага» былі папулярнымі да самай Другой сусветнай вайны. Адной з лепшых «сумленных імітацый» было пеністае віно з агрэста — яго рэцэпт можна прачытаць і ў славутай «Літоўскай гаспадыні» Ганны Цюндзявіцкай.

У паэме Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш» у адным месцы крытыкуюцца прагныя гаспадары, якія ашчаджаюць на сапраўдных добрых вінах, найперш на ўлюбёных шляхтай вугорскіх:

Не раз крычыць паніч, што ён не церпіць збыткаў,
А скупіцца гасцей карміць, падаць напіткаў,
Венгерскага шкадуе, цешыцца шатанскім
Маскоўскім сфальшаваным нейкім там шампанскім.

Тут спляліся разам недавер да падробак, якія запаланілі рынак, і рэфлекторная непрыязнасць да ўсяго маскоўскага, расійскага, характэрная для шляхты, заўжды гатовай да чарговага паўстання. Хоць прэтэнзіі да якасці расійскага напою, магчыма, былі неабгрунтаванымі. Напрыклад, шампанскае графа Варанцова з крымскага маёнтка Ай-Даніль было годным напоем, як і іншыя лепшыя ўзоры вінаробства на поўдні імперыі, і толькі шматвекавая варожасць і ганарлівасць не дазвалялі прызнаць за імі яўныя вартасці. Ну, а само пазначэнне «шампанскае» ў той час яшчэ не было абаронена па прыкмеце геаграфічнага паходжання.

Каралеўскі Станіслаў Радзівіл «Пане Каханку» (1734-1790) быў самым адданым спажыўцом шампанскага на досвітку яго з'яўлення ў нас — хаця, магчыма, не з-за любові да самога напою, а з меркаванняў прэстыжу.

Адна з сучасных марак беларускага пеністага віна называецца «Радзівіл». Выпадкова ці не, але вытворцы ўгадалі «хроснага бацьку» гэтага прадукту, калі мець на ўвазе персанальна Караля Радзівіла «Пане Каханку».

Але чым бліжэй да нашага часу, тым усё больш залагоджваўся ў яснавельможных паноў недавер да пеністых вінаў расійскага паходжання, асабліва калі ў канцы XIX стагоддзя заблішчэла слава завода князя Галіцына ў крымскім жа Новым Свеце. Але, вядома, французскія маркі заўсёды шанаваліся вышэй. Напрыклад, для сустрэчы Новага 1912 года ў Менску вінная крама Ю. Кітаіна прапаноўвала шампанскае марак: «Mumm», «Monopole», «Pommery», «Clicquot», «Roederer», «Moet & Chandon», «Crystal» па кошце... ад 60 коп. за бутэльку (даваенных царскіх капеек!). Шампанскае ў апошнія дзесяцігоддзі Расійскай імперыі настолькі стала асацыявацца з дабрабытам і поспехам, што змагло выстаяць нават у савецкую эпоху, калі ідэалагічныя ўлады жорстка змагаліся з праявамі буржуазнага ладу жыцця, нічым не больш «распуснымі», чым пеністае віно.

З 1937 года існуе марка «Савецкае шампанскае» — сімвал поўнай і канчатковай перамогі сацыялізму, якая выпускалася на шмат якіх заводах былога СССР. У 1978 годзе яго пачалі вырабляць таксама і ў Мінску, які да гэтага ніколі не прэтэндаваў на ролю вінаробнага цэнтра. 17 лютага на канвееры з'явілася першая бутэлька, а 23 лютага адбыліся першыя рознічныя продажы. Усяго за люты 1978 года было выпушчана... толькі 2000 бутэлек. Бо практычна ўсе аперацыі рабіліся ўручную. А сёння за 1 гадзіну на канвееры вырабляецца 8000 бутэлек. Густы сённяшніх пакупнікоў паступова набліжаюцца да сусветных трэндаў, ад паўсалодкіх да паўсухіх і сухіх марак.

Нядаўна ў беларускамоўным асяроддзі паўстала спрэчка, што вылілася і ў анлайн-галасаванне: як называць пеністыя віны па-беларуску? Асабліва калі правілы міжнароднага гандлю, Сусветнай гандлёвай арганізацыі з цягам часу непазбежна прымусяць адмовіцца ад тэрміна «шампанскае». З вялікім адрывам пакуль лідзіруе слова «шумлівае», ад «шум» — «пена», блізкае, дарэчы і да старажытнага чэшскага эпітэта такога віна (sumive vino). Гэтае слова, паводле ініцыятараў галасавання, найбольш адпавядае ўнутранай логіцы беларускай мовы. Што ж, не будзем забывацца, што глабалізацыя наступае няўмольна, і цалкам магчыма, што пра «шампанскае» беларускай вытворчасці давядзецца ўсё ж забыць. І тады адметнае беларускае слова будзе ў цане. Як cava ў Іспаніі, franciacorta, prosecco, lambrusco і bracchetto ў Італіі, sekt у Германіі, wino musujace ў Польшчы. Так што пажадаем поспеху нашым вытворцам, а спажыўцам — не толькі магчымасці выбіраць, але і глыбокіх ведаў як вартасцяў розных напояў, так і айчыннай гісторыі.

Віно з агрэсту шыпучае, падобнае да шампанскага

ПАВОДЛЕ «ЛІТОЎСКАЙ ГАСПАДЫНІ»

Сорак фунтаў (1 фунт роўны 410 г) агрэсту, не зусім спелага, размінаюць, не расціраючы зярняты, і разбаўляюць у трыццаці двух фунтах рачной вады. Сумесь пакідаюць стаяць спакойна дваццаць чатыры гадзіны. Потым праз мяшкі моцна выціскаюць, палошчуць яшчэ раз вадой і працэджваюць. У гэтым соку разводзяць трыццаць фунтаў цукру і дадаюць столькі вады, каб атрымалася сумесь вагой у восемдзесят чатыры фунты. Усыпаюць яшчэ дванаццаць лотаў (1 лот роўны 12,8 г) сырога віннага каменю і ставяць пасудзіну ў цяпло (50-60°C). Праз сорак восем гадзін, як пачнецца браджэнне (без дражджэй), зліваюць раствор у барылы (бочачкі), напаўняючы да самага верху. І ў далейшым захоўваюць іх поўнымі, каб пена магла сплываць.

Потым пераносяць посуд у халодны склеп, дзе віно яшчэ некаторы час будзе брадзіць, а пасля барылы шчыльна затыкаюць. У студзені ўжо льга зліць напой з мутнага асадку. Калі на той час віно яшчэ залішне салодкае, трэба пакінуць яго ў барылах і моцна варушыць, каб зноў пенілася. Тады яно зробіцца падобным на шампанскае.

Хто хоча, каб віно заставалася салодкім і моцна пенілася, нехай дасць дзесяць фунтаў цукру звыш адмераных трыццаці. У супрацьлеглым выпадку бяруць толькі дваццаць пяць.

Калі не заткнуць хутка бочку, віно не будзе шыпець, бо вуглякіслы газ з яго выдаліцца. Таму, уносячы яго ў склеп, неабходна хаця б трохі закрыць, а калі не вырве шпунт, можна ўжо і моцна забіць яго.

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

АБ РАТЫФІКАЦЫІ ДАГАВОРА АБ ЕЎРАЗІЙСКІМ ЭКАНАМІЧНЫМ САЮЗЕ

Прыняты Палатай прадстаўнікоў
Ухвалены Саветам Рэспублікі

9 кастрычніка 2014 года
9 кастрычніка 2014 года

Артыкул 1. Ратыфікаваць Дагавор аб Еўразійскім эканамічным саюзе, падпісаны ў г. Астане 29 мая 2014 года (далей — Дагавор), з наступнай заявай:

«Рэспубліка Беларусь заяўляе, што добрасумленна будзе выконваць свае абавязацельствы ў рамках Дагавора і ажыццявіць іншыя меры па яго рэалізацыі пры ўмове, што да гэтага моманту на трохбаковай або двухбаковай аснове будуць дасягнуты канкрэтныя дамоўленасці аб зняцці бар'ераў, абмежаванняў і канфіскацый ў гандлі асобнымі відамі тавараў і аказанні асобных відаў паслуг, у першую чаргу, у дачыненні да энерганосьбітаў, прадукцыі зборачных вытворчасцяў, лібералізацыі аўтамабільных перавозак і іншых адчувальных пазіцый.

Пры гэтым гэтыя дамоўленасці павінны змяшчаць палажэнні аб недапушчальнасці іх пагаршэння ў наступны перыяд да поўнай ліквідацыі канфіскацый і абмежаванняў у Еўразійскім саюзе.».

Артыкул 2. Прызнаць, што страцілі сілу з даты ўступлення ў сілу Дагавора:

1. Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 2008 года «Аб ратыфікацыі Дагавора аб стварэнні адзінай мытнай тэрыторыі і фарміраванні мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 172, 2/1477).

2. Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 2008 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб парадку ўступлення ў сілу міжнародных дагавораў, накіраваных на фарміраванне дагаворна-прававой базы мытнага саюза, выхаду з іх і далучэння да іх» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 172, 2/1478).

3. Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 2008 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб адзіным мытна-тарыфным рэгуляванні» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 173, 2/1480).

4. Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 2008 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб адзіных мерах нетарыфнага рэгулявання ў дачыненні да трэціх краін» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 173, 2/1483).

5. Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 2008 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб прымяненні спецыяльных ахоўных, антыдэмпінгавых і кампенсацыйных мер у дачыненні да трэціх краін» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 174, 2/1482).

6. Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 2008 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб увядзенні мытнай статыстыкі знешняга і ўзаемнага гандлю таварамі мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 174, 2/1487).

7. Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 2008 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб прынцыпах спагнання ўскосных падаткаў пры экспарце і імпарце тавараў, выкананні работ, аказанні паслуг у мытным саюзе» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 174, 2/1488).

8. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб умовах і механізме прымянення тарыфных квот» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 18, 2/1631).

9. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб прадастаўленні тарыфных ільгот» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 18, 2/1632).

10. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб умовах і парадку прымянення ў выключных выпадках ставак увазных мытных пошлін, адрозных ад ставак Адзінага мытнага тарыфу» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 18, 2/1633).

11. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб Сакратарыяце Камісіі мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 18, 2/1635).

12. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб відах мытных працэдур і мытных рэжымаў» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 18, 2/1636).

13. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб парадку дэкларавання тавараў» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 18, 2/1637).

14. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб парадку мытнага афармлення і мытнага кантролю ў дзяржавах — удзельніцах мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 19, 2/1638).

15. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб парадку дэкларавання мытнага кошту тавараў, што перамяшчаюцца праз мытную мяжу мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 19, 2/1639).

16. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб парадку ажыццяўлення кантролю правільнасці вызначэння мытнага кошту тавараў, што перамяшчаюцца праз мытную мяжу мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 19, 2/1640) .

17. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб парадку вылічэння і выплаты мытных плацяжоў у дзяржавах — удзельніцах мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 19, 2/1641).

18. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб абмене інфармацыяй, неабходнай для вызначэння і кантролю мытнага кошту тавараў, паміж мытнымі органамі Рэспублікі Беларусь, Рэспублікі Казахстан і Расійскай Федэрацыі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г. , № 19, 2/1642).

19. Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб парадку вядзення і прымянення мер, якія закранаюць знешні гандаль таварамі, на адзінай мытнай тэрыторыі ў дачыненні да трэціх краін» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 19, 2/1662).

20. Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб правілах ліцэнзавання ў сферы знешняга гандлю таварамі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 27, 2/1663).

21. Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб статусе Цэнтра мытнай статыстыкі Камісіі мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 158, 2/1689).

22. Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб парадку перадачы даных статыстыкі знешняга гандлю і статыстыкі ўзаемнага гандлю» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 158, 2/1690).

23. Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні змен у Пагадненне аб прынцыпах спагнання ўскосных падаткаў пры экспарце і імпарце тавараў, выкананні работ, аказанні паслуг у мытным саюзе ад 25 студзеня 2008 года» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 162, 2/1698).

24. Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб парадку спагнання ўскосных падаткаў і механізме кантролю за іх выплатай пры экспарце і імпарце тавараў у мытным саюзе» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 170, 2/1699).

25. Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб парадку спагнання ўскосных падаткаў пры выкананні работ, аказанні паслуг у мытным саюзе» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 170, 2/1700).

26. Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення мытнага саюза па ветэрынарна-санітарных мерах» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 170, 2/1704).

27. Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення мытнага саюза аб каранціне раслін» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 170, 2/1705).

28. Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення мытнага саюза па санітарных мерах» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 170, 2/1707).

29. Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб абарачэнні прадукцыі, якая падлягае абавязковай ацэнцы (пацвярджэнню) адпаведнасці, на мытнай тэрыторыі мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 170, 2/1711).

30. Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб узаемным прызнанні акрэдытацыі органаў па сертыфікацыі (ацэнцы (пацвярджэнню) адпаведнасці) і выпрабавальных лабараторый (цэнтраў), якія выконваюць работы па ацэнцы (пацвярджэнню) адпаведнасці» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 170, 2/1712).

31. Закон Рэспублікі Беларусь ад 2 ліпеня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб устанаўленні і прымяненні ў мытным саюзе парадку залічэння і размеркавання ўвазных мытных пошлін (іншых пошлін, падаткаў і збораў, якія маюць эквівалентнае дзеянне)» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 162, 2/1696).

32. Закон Рэспублікі Беларусь ад 2 лістапада 2010 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні змяненняў у Пагадненне мытнага саюза аб каранціне раслін ад 11 снежня 2009 года» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 266, 2/1730).

33. Закон Рэспублікі Беларусь ад 2 лістапада 2010 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні змяненняў у Пагадненне мытнага саюза па ветэрынарна-санітарных мерах ад 11 снежня 2009 года» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 266, 2/1731).

34. Закон Рэспублікі Беларусь ад 2 лістапада 2010 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні змяненняў у Пагадненне мытнага саюза па санітарных мерах ад 11 снежня 2009 года» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 266, 2/1732).

35. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб узгодненай макраэканамічнай палітыцы» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1757).

36. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб узгодненых прынцыпах валютнай палітыкі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1758).

37. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб стварэнні ўмоў на фінансавых рынках для забеспячэння свабоднага руху капіталу» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1759).

38. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб гандлі паслугамі і інвестыцыях у дзяржавах — удзельніцах Адзінай эканамічнай прасторы» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1760).

39. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб парадку арганізацыі, кіравання, функцыянавання і развіцця агульных рынкаў нафты і нафтапрадуктаў Рэспублікі Беларусь, Рэспублікі Казахстан і Расійскай Федэрацыі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1762).

40. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб адзіных прынцыпах і правілах тэхнічнага рэгулявання ў Рэспубліцы Беларусь, Рэспубліцы Казахстан і Расійскай Федэрацыі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1763) .

41. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб адзіных правілах давання прамысловых субсідый» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1764).

42. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб адзіных правілах дзяржаўнай падтрымкі сельскай гаспадаркі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1765).

43. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб адзіных прынцыпах і правілах рэгулявання дзейнасці суб'ектаў натуральных манаполій» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1766).

44. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб правілах доступу да паслуг суб'ектаў натуральных манаполій у сферы транспартавання газу па газатранспартных сістэмах, уключаючы асновы цэнаўтварэння і тарыфнай палітыкі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1767).

45. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб забеспячэнні доступу да паслуг натуральных манаполій у сферы электраэнергетыкі, уключаючы асновы цэнаўтварэння і тарыфнай палітыкі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1768).

46. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб адзіных прынцыпах і правілах канкурэнцыі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1769).

47. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб адзіных прынцыпах рэгулявання ў сферы аховы і абароны правоў інтэлектуальнай уласнасці» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1770).

48. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб дзяржаўных (муніцыпальных) закупках» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1771).

49. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб рэгуляванні доступу да паслуг чыгуначнага транспарту, уключаючы асновы тарыфнай палітыкі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1772).

50. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2010 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб прававым статусе працоўных-мігрантаў і членаў іх сем'яў» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 312, 2/1773).

51. Закон Рэспублікі Беларусь ад 3 чэрвеня 2011 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб стварэнні, функцыянаванні і развіцці інтэграванай інфармацыйнай сістэмы знешняга і ўзаемнага гандлю мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 65, 2/1824).

52. Закон Рэспублікі Беларусь ад 3 чэрвеня 2011 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб прымяненні інфармацыйных тэхналогій пры абмене электроннымі дакументамі ў знешнім і ўзаемным гандлі на адзінай мытнай тэрыторыі мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 65, 2/1825).

53. Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 ліпеня 2011 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб асобных часовых выключэннях з рэжыму функцыянавання адзінай мытнай тэрыторыі мытнага саюза» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 80, 2/1842).

54. Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2011 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб парадку давання органу, які праводзіць расследаванні, звестак, якія змяшчаюць у тым ліку канфідэнцыйную інфармацыю, для мэтаў расследаванняў, што папярэднічаюць увядзенню спецыяльных ахоўных, антыдэмпінгавых і кампенсацыйных мер у дачыненні да трэціх краін» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 84, 2/1849).

55. Закон Рэспублікі Беларусь ад 25 лістапада 2011 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб парадку прымянення спецыяльных ахоўных, антыдэмпінгавых і кампенсацыйных мер на працягу пераходнага перыяду» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 136, 2/1868).

56. Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 снежня 2011 года «Аб ратыфікацыі Дагавора аб Еўразійскай эканамічнай камісіі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 141, 2/1876).

57. Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 мая 2012 года «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб рэгуляванні ў сферы ахвотнага страхавання і ўзаемнага гандлю ваеннымі таварамі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2012, № 62, 2/1931).

58. Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 ліпеня 2012 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб парадку абмену інфармацыяй, звязанай з выплатай увазных мытных пошлін» (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 18.07.2012, 2/1945).

59. Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 ліпеня 2012 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Пагадненне аб прымяненні спецыяльных ахоўных, антыдэмпінгавых і кампенсацыйных мер у дачыненні да трэціх краін ад 25 студзеня 2008 года» (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 20.07.2012, 2/1965).

60. Закон Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2012 года «Аб ратыфікацыі Дагавора аб узаемадзеянні ўпаўнаважаных органаў дзяржаў — удзельніц Пагаднення аб узгодненых прынцыпах валютнай палітыкі ад 9 снежня 2010 года, якія ажыццяўляюць валютны кантроль» (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 31.01.2013, 2/2010).

61. Закон Рэспублікі Беларусь ад 16 чэрвеня 2014 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Пагадненне аб умовах і механізме прымянення тарыфных квот ад 12 снежня 2008 года» (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 19.06.2014, 2/2156).

62. Закон Рэспублікі Беларусь ад 16 чэрвеня 2014 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні змяненняў у Пратакол аб умовах і парадку прымянення ў выключных выпадках ставак увазных мытных пошлін, адрозных ад ставак Адзінага мытнага тарыфу, ад 12 снежня 2008 года» (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 19.06.2014, 2/2157).

63. Закон Рэспублікі Беларусь ад 16 чэрвеня 2014 года «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні змяненняў у Пагадненне аб адзіным мытна-тарыфным рэгуляванні ад 25 студзеня 2008 года» (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 19.06.2014, 2/2158).

Артыкул 3. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь прыняць захады, неабходныя для рэалізацыі палажэнняў Дагавора.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
А. ЛУКАШЭНКА
9 кастрычніка 2014 года, г. Мінск
№ 193—3

■ Погляд

ШТО АДБЫВАЕЦЦА Ў ГАНКОНГУ?

У канцы верасня — пачатку кастрычніка ў Ганконгу прайшлі магутныя вулічныя дэманстрацыі, якія заходнія СМІ тут жа ахрысцілі «рэвалюцыяй руж». У чым прычына цяперашніх пратэстаў у Ганконгу?

Тут мноства фактараў. Перш за ўсё, праблема ў розным успрыманні свету мацерыковым кітайцам і жыхаром Ганконга. У першага вельмі моцныя патрыятычныя пачуцці — ён хоча, каб яго краіна стала вялікай і магутнай, і ўзровень жыцця ў ёй узняўся да ўзроўню таго ж Ганконга праз паступальнае развіццё кітайскай эканомікі. І ў яго няма падстаў для незадаволенасці кіруючай Камуністычнай партыяй, пры якой з 1970-х гадоў узровень жыцця ў краіне вырас разоў у 60-70.

Аднак культурнае, сацыяльнае і палітычнае асяроддзе Ганконга фарміравалася брытанскім урадам. Так, насельнікі горада з'яўляюцца кітайцамі, але кітайцамі дастаткова спецыфічнымі. Яны жылі і выхоўваліся ў зусім іншай культурнай і сацыяльнай парадыгме, якая створана чыноўнікамі брытанскага ўрада і адпавядае нацыянальным інтарэсам Вялікабрытаніі. Людзі вучыліся або ў Вялікабрытаніі, або ў брытанскіх школах на тэрыторыі Ганконга, сталі носьбітамі пэўнага набору заходніх ліберальна-дэмакратычных каштоўнасцяў.

Таксама на менталітэт жыхароў горада вельмі сур'ёзны ўплыў аказалі падзеі 1997 года, калі брытанскі ўрад вярнуў горад Кітаю, не спытаўшы пры гэтым у мясцовага насельніцтва, ці хоча яно вяртацца. Многія гэта ўспрынялі негатыўна, паколькі на момант перадачы горада ўзровень жыцця ў ім быў значна вышэйшы, чым нават у самых паспяховых гарадах мацерыковага Кітая Пекіне і Шанхаі (не кажучы ўжо пра сярэднекітайскі ўзровень у цэлым).

На тэрыторыі горада сканцэнтраваны штаб-кватэры шэрагу найбуйнейшых сусветных транснацыянальных карпарацый. Таму некаторыя жыхары горада палічылі абразай для сябе гэтую перадачу. І ўвесь гэты час яны захоўвалі сімпатыі да таго ладу, які быў пры брытанцах. Усе гэтыя гады напружанасць узмацнялася, і цяпер фактычна выплюхнулася вонкі.

Калі Ганконг вярталі Кітаю, умовы вяртання і «патуранні» для жыхароў Ганконга былі прапісаны вельмі прыблізна. Галоўным лічылі прынцып «адна краіна — дзве сістэмы», а пра канкрэтыку тады неяк не падумалі. Брытанцы, вядома, спрабавалі правесці максімальную колькасць асаблівых правоў для жыхароў Ганконга, але кітайскі ўрад па шэрагу пытанняў адмаўляўся ісці на сур'ёзныя ўступкі.

З іншага боку, Пекін таксама можна і трэба зразумець. Кітайская Народная Рэспубліка не хоча мець на тэрыторыі Ганконга сур'ёзныя праблемы, створаныя выбарам насельніцтвам празаходняга палітычнага дзеяча. Таму Кітай абараняе свае інтарэсы на сваёй спрадвечнай зямлі, пазычанай Вялікабрытаніяй у свой час пры вельмі непрывабных абставінах, і заклікае мясцовае насельніцтва паважаць кітайскія законы.

Увогуле ж жыхарам Ганконга трэба прывыкаць да таго, што яны кітайцы, вучыцца падзяляць каштоўнасці, распаўсюджаныя на тэрыторыі мацерыковага Кітая. Большасць людзей сярэдняга ўзросту, дарэчы, гэта разумее і спрабуе адаптавацца. А вось нонканфармісцкая радыкальная моладзь, якая, як звычайна, хоча ўсё і адразу, адмаўляецца — і выходзіць на вуліцы.

Многія эксперты сцвярджаюць, што пратэсты былі інспіраваны ЗША. Але тут больш важна тое, што гэтую руку бачаць самі кітайцы. Насельніцтва мацерыковага Кітая наогул схільнае ўскладаць на ЗША віну не толькі за хваляванні ў Ганконгу, але і за шэраг іншых негатыўных падзей, што адбываюцца на тэрыторыі Кітая апошнім часам (тэракты ў буйных гарадах, беспарадкі ў Сіньцзян-Уйгурскай аўтаномнай акрузе). Журналісты, палітолагі і звычайныя людзі практычна адзіныя ў думцы, што гэтыя падзеі сталі пакараннем Пекіну за яго спрэчкі з Вашынгтонам у пытаннях сусветнай палітыкі. У прыватнасці, Ганконг стаў помстай за тое, што ў апошнія месяцы Кітай занадта цесна збліжаецца з Расійскай Федэрацыяй.

Што да рэальнасці, то, вядома, з пункта гледжання класічнай геапалітыкі Злучаным Штатам і Вялікабрытаніі выгадна інспіраваць беспарадкі на тэрыторыі Кітая. КНР развіваецца так добра і так паспяхова, што гэта выклікае панічны страх у заходніх урадаў.

Так, амерыканцы ўсур'ёз асцерагаюцца за сваю палітычную будучыню, і не толькі ў рэгіёне Усходняй Азіі, але і ў свеце ў цэлым. І ўлічваючы, што ў пытаннях знешняй палітыкі ні Вашынгтон, ні Лондан ніколі асабліва не саромеліся сумніўных метадаў, я не буду моцна здзіўлены, калі яны насамрэч прыклалі руку да распальвання ўнутранага канфлікту ў Ганконгу праз мясцовыя фонды або сродкі масавай інфармацыі. Такім чынам яны спрабуюць трывожыць канкурэнта і стварацьунутраныя перашкоды на шляху яго развіцця і экспансіі.

Але калі паглядзець на сітуацыю са стратэгічнага пункту гледжання, то амерыканцам і брытанцам не трэба было б удзельнічаць у ганконгскіх падзеях або іншых беспарадках на тэрыторыі Кітая, не кажучы ўжо пра тое, каб інспіраваць іх. Усё гэта выклікае вельмі сур'ёзнае раздражненне ў кітайскай эліты і насельніцтва, перашкаджае збліжэнню паміж Кітаем і Захадам і робіць узвышэнне Паднябеснай вельмі небяспечным для ЗША і Еўропы працэсам.

Нарэшце, падзеі ў Ганконгу могуць замарудзіць працэс палітычнай рэформы ў Кітаі, што таксама не ў інтарэсах Захаду. Пекіну важна не проста ўкараняць на тэрыторыі Кітая нейкія абстрактныя дэмакратычныя працэдуры, а рабіць гэта акуратна і паступова, каб працэс узвышэння Кітая не быў спынены. І калі на прыкладзе Ганконга Кітай убачыць, што працэс дэмакратызацыі можа страціць кіравальнасць і павышае рызыку дэстабілізацыі краіны, то ён перагледзіць свой падыход.

Сяргей КІЗІМА,
доктар палітычных навук

■ Не прапусціце!

100 гадоў пасля Першай сусветнай

У МАГІЛЁВЕ СТВАРЫЛІ ЎНІКАЛЬНУЮ ПЕРАСОВАЧНУЮ ВЫСТАВУ, ПРЫСВЕЧАНУЮ ПАДЗЕЯМ ВЯЛІКАЙ ВАЙНЫ 1914-1918 ГАДОЎ НА ЎСХОДЗЕ БЕЛАРУСІ

Такая колькасць малавядомых фактаў аб Першай сусветнай вайне, у якой удзельнічалі 38 дзяржаў і на палях якой змагаліся звыш 70 мільёнаў чалавек, сабрана ўпершыню. У аснову выставы пакладзены зведкі яшчэ не выдадзенай кнігі магілёўскага пісьменніка, кіраўніка гісторыка-патрыятычнага пошукавага атрада «Вікру» Мікалая Барысенкі «Рэха Вялікай вайны на Усходзе Беларусі». На ёй прадстаўлены рэдкія фота і дакументы з расійскіх архіваў.

— У той час у склад Магілёўскай губерні ўваходзілі сучасныя Гомельская вобласць і частка Віцебскай, — кажа аўтар. — Гэта быў тылавы раён арміі Расійскай імперыі. Вядома, што тут знаходзілася не менш за 25 шпіталяў, праз губерню праходзілі сотні тысяч бежанцаў. Шмат імён нашых землякоў, якія дэманстравалі прыклады сапраўднай мужнасці на той вайне, несправядліва забытыя. Сёння вядомы імёны толькі 160 Георгіеўскіх кавалераў, ураджэнцаў губерні, з іх 36 — поўных і 2 — уладальнікаў «поўных бантаў». Мы жывём у горадзе, дзе знаходзілася стаўка Мікалая II, але не можам пахваліцца добрым веданнем падзей таго перыяду. І тое, што можна ўбачыць на выставе, для многіх стане сапраўдным адкрыццём.

Перасовачная выстава пабывае ва ўсіх школах Магілёўшчыны. Але гэта толькі невялікая частка той інфармацыі, якая прадстаўлена ў кнізе Мікалая Барысенкі. На жаль, яна пакуль існуе ў адзіным экзэмпляры, і тое камп'ютарным. Затрымка толькі за спонсарам, які не пашкадаваў бы сродкаў на гэта ўнікальнае выданне.

Нэлі ЗІГУЛЯ

■ Ну і ну!

Выхадная дапамога — мільярд!

Выхадныя дапамогі — да 1 мільярда рублёў — такія «бонусы» атрымлівалі члены ліквідацыйнай камісіі прадпрыемства. Яны, як высветлілі рэвізоры, наогул стараліся максімальна прадоўжыць тэрміны ліквідацыі. Пры гэтым не спяшаліся выплачваць даўгі.

— Гандлёва -вытворчае закрытае акцыянернае таварыства «Палярыс», пачынаючы з 2008 года па рашэнні ўласнікаў — у стадыі ліквідацыі. Пры гэтым ажыццяўлялася забароненая прадпрымальніцкая дзейнасць, не звязаная з ліквідацыяй. Аказваліся паслугі аўтамабільных стаянак і ажыццяўлялася здача ўнаём нерухомасці таварыства. І рабілася гэта пад кіраўніцтвам старшыні ліквідацыйнай камісіі. Ён жа — заснавальнік прадпрыемства і былы дырэктар, — паведамілі «Звяздзе» ва ўпраўленні Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю па Віцебскай вобласці.

У выніку ў 2011—2014 гг. фірма атрымала даход — 4,7 млрд рублёў. Пры гэтым мела запазычанасць — каля 19 млрд — перад рознымі суб'ектамі гаспадарання і грамадзянамі... Замест таго, каб «выплачваць па рахунках», «ліквідатары» атрымлівалі добрыя грошы.

Выхадныя дапамогі членам ліквідацыйнай камісіі сёлета склалі ад 250 мільёнаў да 1 мільярда рублёў — у залежнасці ад стажу працы і займаемай пасады, — удакладніў **Юрый ШЫРАКОЎ, намеснік начальніка вышэйзгаданага ўпраўлення.**

Па матэрыялах праверкі эканамічны суд Віцебскай вобласці прыцягнуў камерцыйную структуру да адміністрацыйнай адказнасці — штрафу ў памеры 50 базавых велічынь (7,5 млн рублёў. — **Аўт.**). Быў канфіскаваны і незаконна атрыманы даход — больш за 4 млрд рублёў. Між іншым адпаведную судовую пастанову фірма абскардзіла ў Вярхоўным Судзе. Але па выніках разгляду скаргі пастанову пакінулі ў сіле ў поўным аб'ёме.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■ Кранальнае

МАЦІ ІМ ЗАМЯНІЛА ЖЭНЯ

СТАРЭЙШАЯ СЯСТРА АКАЗАЛАСЯ МАЦНЕЙШАЙ ЗА БАЦЬКУ-ФРАНТАВІКА

Аб прыкладах мацярынскай самаахвярнасці і адданасці напісана і сказана шмат. Але ёсць жанчыны, якія ўсю сваю пяшчоту аддалі не родным дзецям. Як Жэня Гуз, што стала маці ўласным сёстрам і братам. Самой яе, на жаль, ужо няма. Памерлі і шасцёра з сямі яе выхаванцаў, але аб ёй не забываюць іх дзеці і ўнукі. Родная пляменніца жанчыны — Таццяна Глаўшык, калі распавядае пра сваю гераічную цётку, не стрымлівае слёз. Гісторыя жыцця Яўгеніі Фёдараўны, ці як клічуць яе нашчадкі — Жэні, і насамрэч кранае…

Сваю мацярынскую пяшчоту Яўгенія Гуз аддала братам і сёстрам.

У сям'і Марфы і Фёдара Гуз было 8 дзяцей. Калі пачалася вайна, самай малодшай, Ганульцы, споўніўся годзік, старэйшай — Жэні — 14. Бацька пайшоў на фронт, а маці з дзецьмі, як і астатнія жыхары іх гомельскай вёсачкі з гераічнай назвай Камсамольск, пайшла ў лес. Вёску час ад часу бамбілі і прачэсвалі немцы. Але Марфа позна зразумела, што ў лесе ім без каровы не выжыць. Трэба было чымсьці карміць малую — свайго малака, на жаль, не было. І яна рызыкнула…

Дзеці так і не дачакаліся тады сваю маці, а на наступны дзень старэйшая Жэня сама адправілася на яе пошукі ў вёску. Агледзела, здаецца, усё, але безвынікова. Спынілася каля бацькоўскага калодзежа і раптам быццам адчула матулін голас: «Дачушка, я тут…» Яе сэрца балюча працяла жудасная здагадка. Хуценька зазірнула ўнутр, але нічога, акрамя разламаных лавак і сталоў, не ўбачыла. Толькі нешта ёй падказвала: маці там. У роспачы пабегла ў лес і паклікала малодшых братоў, каб дапамаглі разабраць той калодзеж. Сэрца не падманула: пад драўляныміабломкамі мэблі яны знайшлі сваю маці. Потым ад кагосьці яны даведаліся, што жанчына ўжо накіроўвалася з каровай у лес, калі ў вёску наляцелі немцы. Яе схапілі, прымушалі прызнацца, дзе партызаны, а потым расстралялі.

Напэўна, само неба плакала, калі бачыла, як 8–10-гадовыя дзеці капалі ямку на мясцовых могілках, каб пахаваць сваю маці. Асірацелыя хлопчыкі і дзяўчынкі, здаецца, пасталелі на шмат гадоў. Пяцігадовы Саша яшчэ доўга не мог супакоіцца, што маці болей няма. Сваімі маленькімі ручкамі ён разграбаў лісце на той лясной сцяжынцы, па якой яна ў апошні раз ішла ў вёску. Шукаў яе сляды, каб дакрануцца да іх і адчуць мацярынскае цяпло.

Пра вайну ў сям'і не вельмі любілі ўзгадваць. У тым жа 1941-м памерла Ганначка. І Жэня цяжка перажывала, што не здолела выратаваць дзяўчынку. Хаця смерць далёка не адыходзіла ад іх убогага жытла. Увесь час, пакуль вёска была пад акупантамі, яны жылі ў выкапанай імі ж змлянцы. Кожны перанёс, напэўна, усе хваробы, якія толькі існуюць на свеце. Старэйшая сястра, быццам анёл, як магла, ратавала.

Менш за ўсё думала Жэня аб сваім асабістым жыцці. Нават адмовіла суседу, які сватаўся да яе пасля вайны. Горка ўздыхнула і адмахнулася: маўляў, не да кахання мне зараз — трэба дзяцей падымаць.

У вызваленую вёску яны вярнуліся не адразу. Немцы спалілі дом, і дзеці з надзеяй чакалі бацьку. Марылі, як ён вернецца з фронту і разам яны адбудуюць сабе новае жытло. Памыліліся. Бацька вярнуўся, але палёгкі гэта не прынесла. Тое, што ён пачуў і ўбачыў, напалохала яго. І ён… здрадзіў. Напэўна, нават вайна не здавалася яму такім цяжкім іспытам, як перспектыва падымаць дзяцей, не маючы ні хаты, ні жонкі. Мужчына збег у суседнюю вёску, дзе хутка знайшоў сабе новую сям'ю. Але 18-гадовая Жэня аказалася мацнейшай за бацьку-франтавіка.

— Яна не аддала сваіх сясцёр і брацікаў нават тады, калі іх спрабавалі забраць у дзіцячы дом, — пераказвае сямейную гісторыю Таццяна. — Сказала, што сама выхавае. Калгас пабудаваў вялікую хату-чытальню, дзе дазволілі прапісацца іх вялікай сям'і. Тут заўсёды было шумна: аднавяскоўцы збіраліся на вячоркі, пралі, шылі, спявалі песні. Замест шпалер на сценах віселі агітплакаты, але ў пакоях заўсёды было ўтульна. Жэня была добрай гаспадыняй. Разам з сястрычкамі яны так націралі драўляную падлогу, што яна, здаецца, блішчала.

Ніякіх паслабленняў сям'і не рабілі. Аднойчы не атрымалася выканаць харчовы падатак, і да іх прыйшлі забіраць карову. Не звярнулі ўвагу нават на тое, што самыя малыя на каленях малілі пакінуць карміцельку, каб не памерці ад голаду. Але, калі разумная карова сама прыйшла праз некалькі дзён дадому, ніхто яе другі раз забіраць не стаў. Быў выпадак, калі дзеці на тры месяцы засталіся без сваёй любімай Жэні. Яе пасадзілі ў… турму, за тое, што яна, калі захварэла, не змагла прыйсці на працу. А прастудзілася дзяўчынка на лесапавале, калі, стоячы ў халоднай вадзе, разам з іншымі сплаўляла лес.

Менш за ўсё думала Жэня аб сваім асабістым жыцці. Нават адмовіла суседу, які сватаўся да яе пасля вайны. Горка ўздыхнула і адмахнулася: маўляў, не да кахання мне зараз — трэба дзяцей падымаць. Але, кажуць, яны потым усё жыццё сябравалі, нават тады, калі, страціўшы надзею, Даніла ажаніўся. Калі трэба, прыходзіў пакалоць дровы ці паправіць дах.

А калі дзеці выраслі і адно за адным разляцеліся па ўсім свеце, Жэня чакала ад іх лістоў і слала пасылкі. Міша з Мікалаем паехалі шукаць шчасце ў Маскву, Валодзя стаў мараком і асеў на Далёкім Усходзе. Саша наогул пайшоў у навуку, працаваў дэканам у адной з мінскіх ВНУ. Сафія, маці маёй суразмоўцы, знайшла сваё шчасце ў Магілёве. Толькі Надзя засталася ў вёсцы, але, калі выйшла замуж, пераехала ад старэйшай сястры да мужа. У вялікай хаце-чытальні засталася адна Жэня. Але адзінокай яна сябе не адчувала: кожны з яе выхаванцаў наведваўся некалькі разоў у год.

— Мы з сёстрамі кожнае лета праводзілі ў яе, — з пяшчотай у голасе ўспамінае цётку Таццяна. — Як жа хутка спраўлялася па гаспадарцы! Мы яшчэ спім, а яна ўсё пераробіць, печ выпаліць, сняданак прыгатуе і ў лес у грыбы пабяжыць.

А яшчэ ў памяці засталіся тыя вясёлыя сямейныя сустрэчы ў любімай цётачкі. Калі ў хаце збіраліся ўсе браты і сёстры разам са сваімі дзецьмі, здавалася, няма ва ўсім свеце больш утульнага месца, чым гэта. А як забыць тыя вячоркі ў садзе за самаварам! Колькі розных гісторый можна было пачуць за сталом! І твар Жэні свяціўся ад шчасця. Пляменніца, здаецца, і цяпер чуе яе пранікнёны мілагучны спеў: «Успомні мяне, мамка, хоць раз на тыдзень. А я цябе, мамку, на дні разоў 40 …» У гэтай сям'і слова «маці» было нечым па-сапраўднаму святым. Яно быццам нябачнай ніцінай злучала кожнага з дзяцей…

Больш дружнай сям'і цяжка было знайсці ва ўсей вёсцы. А можа, нават і ва ўсім свеце. Усе галоўныя падзеі яны адзначалі разам. Калі нехта будаваў дом ці кватэру, астатнія дапамагалі. І заўсёды слалі адно аднаму пасылкі. З Далёкага Усходу сёстры і браты атрымлівалі ад Валодзі чырвоную рыбу і ікру. З Масквы ад Мішы і Мікалая ляцелі ў розныя канцы пасылкі з апельсінамі і шакаладнымі цукеркамі. А вось Жэня кожнага забяспечвала сухафруктамі, фасоллю, семкамі і смачнымі сушанымі грыбамі. І ўсім дапамагала грашыма. Ведала, што братам і сёстрам, у якіх растуць дзеці, яны абавязкова на нешта спатрэбяцца.

— А аднойчы да нас у Магілёў прыйшла тэлеграма ад Жэні: бацька вярнуўся, — успамінае Таццяна. — Прасіў дараваць здраду. Цёця такія ж тэлеграмы адправіла ўсім сваім сёстрам і братам. І ўсе яны прыехалі, а дзядзька Валодзя з Далёкага Усходу нават першы. Не ведаю дакладна пра тую размову, але яны даравалі бацьку.

Напэўна, нават вайна не здавалася яму такім цяжкім іспытам, як перспектыва падымаць дзяцей, не маючы ні хаты, ні жонкі. Мужчына збег у суседнюю вёску, дзе хутка знайшоў сабе новую сям'ю.

Цяжка сабе ўявіць такую велікадушнасць. Мы цяпер і малой крыўды часам дараваць не можам. Злуемся адно на аднаго, і нават убачыўшы слёзы, не можам спыніцца. Толькі навошта такія ахвяры? У сям'і Гуз бацьку ніколі не называлі здраднікам. І прынялі як блуднага сына. Ён так і дажываў свой век побач з Жэняй. Цяжка хварэў, але яна даглядала яго да апошняга.

Таццяна Глаўшык беражліва захоўвае гісторыю сям'і.

Любая маці цяжка пераносіць смерць сваіх дзяцей. Жэня — не выключэнне. Сафія, самая малодшая ў сям'і (маці маёй суразмоўцы), пайшла з жыцця адной з першых. Не стала Валодзі, памёр Міша… Яна толькі гаротна ўздыхала і не разумела: «Чаму не я першая?» Але Бог даў Жэні доўгае жыццё. Яе сэрца спынілася, калі ёй споўнілася 82 гады. За яе труной на мясцовыя могілкі ішлі пляменнікі і ўнукі. І кожны не ўтойваў слёз. Для іх яна была самым родным і чулым чалавекам. Як і для сваіх сясцёр і братоў — сапраўдная маці.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота аўтара і з сямейнага архіва

■

Каля той самай хаты-чытальні.

■ Гістарычны ўнікат

ВЯРТАННЕ НА РАДЗІМУ

Найвялікшая воінская святыня праз 100 гадоў апынулася на беларускай зямлі

Сцяг Полацкага кадэцкага корпуса прывезлі ў Беларусь. Цяпер — назаўсёды. Дакладную копію ўзору 1844 года перадалі на часовае захоўванне ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Пасля заканчэння капітальнага рамонту гістарычную рэліквію перададуць у Полацкае кадэцкае вучылішча, якое сёння працягвае традыцыі Полацкага кадэцкага корпуса.

— У савецкія часы мы не маглі звязацца з амерыканскімі кадэтамі і забраць наш сцяг, — расказаў **ганаровы старшыня Беларускага суворaўска-нахімаўскага саюза, генерал-палкоўнік у адстаўцы Пётр ЧАУС.** — Яны сказалі, што аддадуць толькі расіянам. Але наша беларуская кроў разгулялася: як? чаму? Таму мы прынялі рашэнне ўзбудзіць хадайніцтва, і яны далі згоду. З вялікімі цяжкасцямі праз усе межы мы прывезлі яго ў Беларусь.

— У нашу краіну вярнулася не толькі важная гістарычная рэліквія: на Радзіму вярнуўся найвышэйшы сімвал гонару, доблесці і славы, святыня, якой пакланялася не адно пакаленне продкаў, — падкрэсліў падчас урачыстай цырымоніі перадачы сцяга ў музей **дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі генерал-маёр Аляксандр МЯЖУЕЎ.** — Сцяг Полацкага кадэцкага корпуса з'яўляецца своеасаблівым сімвалам пераемнасці пакаленняў беларускіх кадэтаў усіх часоў. Вярнуць сцяг на Радзіму было не так проста. Наша паважлівае стаўленне да гісторыі, тая ўвага, якая цяпер надаецца кадэцкай адукацыі, адыгралі станоўчую ролю. Агульнымі намаганнямі зроблена вялікая і важная справа. Спадзяюся, што вяртанне сцяга Полацкага кадэцкага корпуса стане імпульсам да далейшага развіцця беларускага кадэцкага руху, сродкам духоўна-маральнага і ваенна-патрыятычнага выхавання суворaўцаў і кадэтаў нашай краіны.

Сцяг Полацкага кадэцкага корпуса ўнікальны: гэта адзіны экзэмпляр сцяга таго часу, які захаваўся да сённяшніх дзён. Па сутнасці, гэта самая старажытная воінская рэліквія Беларусі. У пачатку Першай сусветнай вайны яе эвакуявалі ў Югаславію, затым перавезлі ў Злучаныя Штаты Амерыкі. Там, у Знаменскім сінадальным саборы Нью-Ёрка, яна знаходзілася да 2014 года. Вядома, цэлым сцяг перавезці не ўдалося: матэрыі больш чым паўтара стагоддзя. Арыгінальныя яго кавалкі ўкладзены ў спецыяльныя кішэні, зробленыя на новым палатне.

У тым, што воінская рэліквія вярнулася на сваю гістарычную Радзіму, вялікая заслуга Беларускага саюза суворaўцаў і кадэтаў. І гэта нягледзячы на тое, што сцяг, згодна з завяшчаннем, рыхтаваўся для перадачы імператару Расіі (у цяперашнім варыянце — Прэзідэнту).

Перш чым апынуцца на радзіме, сцяг быў асвечаны ў сербскім горадзе Белая Царква — там, дзе воінская рэліквія знаходзілася да 1944 года. Дарэчы, ініцыятарам і ўдзельнікам вяртання кадэцкага сцяга на беларускую зямлю ўручылі памятныя медалі. Сярод узнагароджаных — высокія чыноўнікі і сённяшнія кадэты.

Як пракаменціравалі **намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Віктар ГУМІНСКІ,** нам патрэбны сапраўдныя патрыёты сваёй Радзімы, кім з'яўляюцца суворaўцы і кадэты. «Сцяг, да якога мы сёння дакрануліся, павінен быць для нас не толькі сімвалам, — мяркуе ён. — Сюды, а потым у Полацк, павінны прыходзіць кадэты і суворaўцы, прымаць прысягу, аддаваць даніну павагі традыцыям».

Вераніка КАНЮТА. Фота аўтара

■

НАРОДЖАНЫЯ 13 кастрычніка

Яны сур'ёзна ставяцца да свайго прафесійнага жыцця, мараць аб кар'еры і ганарацца выніковасцю сваёй дзейнасці. Яны надзвычай жорсткія, небяспечныя ворагі, але ўмеюць пераадольваць супрацьстаянне вытрымкай і нахабствам. Яны могуць быць няўмольнымі, непахіснымі, злапамятлівымі, чаму ў іх часта і ўзнікаюць праблемы ў асабістых узаемаадносінах. Яны часта хвалююцца самі і не могуць зрабіць прыемнае іншым, але могуць быць шчодрымі і клапатлівымі да родных і сваякоў. Для іх важна спачатку зразумець сябе, а затым пачынаць будаваць кантакты і сувязі з тымі, хто побач. Ім неабходна навучыцца расслабляцца, атрымліваць задавальненне, менш сур'ёзна ўспрымаць навакольны свет і людзей. Калі яны будуць прытрымлівацца гэтых парад, іх абавязкова чакае поспех, таму што яны валодаюць мэтанакіраванасцю і настойлівасцю.

НАРОДЖАНЫЯ 14 кастрычніка

Памяркоўнасць — лозунг гэтых людзей. Яны звязаны межамі жорсткіх абмежаванняў, надзелены стрыманасцю і самавалоданнем, ім даспадобы ўраўнаважанае і мернае жыццё, таму што яны не любяць таропкасці і таго, калі іх прыспешваюць. Яны не заўсёды вылучаюцца красамоўствам і здольнасцю адкрываць сябе ў мастацкіх вобразах, пісьмовых творах і музыцы. У іх няма прывязанасці да рэчаў і матэрыяльных клопатаў, але свой дом для іх вельмі важны, прычым часам гэтым домам становіцца працоўнае месца. Яны могуць ахапіць увагай, стабільнасцю сваю сям'ю, а таксама сяброў і вялікую колькасць калег. Дзякуючы асабістай стабільнасці і ўраўнаважанасці, многія з іх становяцца самазадаволенымі і хутка спыняюць свой рух наперад, што кепска для іх.

■ Супраць наркотыкаў

Каб не нашкодзіць

НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ ПРАПАНУЮЦЬ УВЕСЦІ АДЗІНУЮ ПАЛІТЫКУ Ў ПРАФІЛАКТЫЦЫ НАРКАМАНІІ

«Мы не баімся прызнаць значны рост выяўленых злачынстваў у гэтай сферы. Менавіта такім чынам становіцца зразумелым рэальны стан спраў. Прырост гэты забяспечваюць спайсы, якія часта ўжываюць пры спробах самасцвердзіцца падлеткі і моладзь», — адзначыў начальнік упраўлення ўнутраных спраў Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Захарчук.

Фігурантамі 82 крымінальных спраў з 828, заведзеных па лініі наркакантролю сёлета, з'яўляюцца навучэнцы розных устаноў. Пры гэтым з вышэйшых — толькі 5 студэнтаў. Магчыма, гэта вынік прафілактычнай работы, якая праводзіцца ў ВНУ Гомеля. Размова ідзе пра дзейнасць чатырох антынаркатычных атрадаў. Асабліва Юрый Маркевіч, начальнік упраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі УУС Гомельскага аблвыканкама, адзначае работу актывістаў руху ў дзяржаўным універсітэце імя Францыска Скарыны. МУС вывучае вопыт Гомельшчыны ў гэтым кірунку.

— Маладыя людзі часта не ўспрымаюць сур'ёзна інфармацыю ад людзей у пагонах, педагогаў або медыкаў, — кажа Юрый Маркевіч. — Між іншым, сапраўды, не кожны з іх здольны даступна данесці падлетку інфармацыю аб шкодзе наркотыкаў. У прафілактыцы наркаманіі галоўнае — не нашкодзіць. Як адмоўны магу прывесці такі прыклад: летась у адну з вясковых школ прывялі былога наркамана з багатым крымінальным мінулым. Ён выступаў перад вучнямі старэйшых класаў і вучыў іх жыццю. Але ж гэта школа, а не цэнтр па рэабілітацыі наркаманаў. Вучні старэйшых класаў вельмі самаўпэўненыя. «Ён змог пазбавіцца ад залежнасці, і я змагу. Чаму б не паспрабаваць разок?» — думаюць яны. Менавіта таму мы прапануем увесці адзіную прадуманую палітыку ў прафілактыцы наркаманіі. Галоўная задача ўсіх, а не толькі міліцыі, — спыніць маладога чалавека ад першай спробы наркотыкаў.

Найбольш складаная сітуацыя з ужываннем наркаатруты ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Пры тым, што ў сістэме адукацыі Гомельшчыны прынцыпова змяніўся падыход да выяўлення юных прыхільнікаў паспрабаваць сумніўныя задавальненні. Раней адміністрацыі ўстаноў утойвалі факты ўжывання наркотыкаў навучэнцамі, бо баяліся негатыўных наступстваў. Цяпер жа ў выпадку самастойнага выяўлення педагогаў не караюць, і такі падыход прыносіць плён. І ўсё ж самымі зацікаўленымі ў вырашэнні гэтай праблемы павінны быць бацькі, адзначаюць праваахоўнікі. Толькі яны могуць заўважыць прыкметы змянення не толькі фізічнага, але фінансавага стану сваіх дзяцей. Ім часта плацяць немалыя грошы за закладку наркотыкаў у схованкі, — падкрэслівае Юрый Маркевіч:

— Распаўсюджванне спайсаў ідзе праз інтэрнэт. Такім чынам наркадылеры вярбуюць «чарнавую рабочую сілу» — часта гэта падлеткі. Між тым за такія дзеянні з наркотыкамі законам прадугледжана ад 8 да 13 гадоў пазбаўлення волі. Сёння наркаманія стала праблемай і тых сем'яў, якія жывуць з дастаткам. Менавіта таму бацькі павінны цікавіцца, як іх дзіця бавіць час. Бо праблему спайсаў рэальна вырашыць толькі агульнымі намаганнямі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ

■

■ Як нас дураць

«ВЫ ПАРУШЫЛІ ЗАКОН…»

Чарговая правакацыя кібермахляроў

Апошнім часам у інтэрнэт-прасторы з'явілася новая махлярская «фішка», прычым «пад шыльдай» праваахоўных органаў, папярэджвае прэс-служба УУС Гродзенскага аблвыканкама.

Ад імя Міністэрства ўнутраных спраў дасылаюцца паведамленні прыкладна такога зместу: «Вамі быў парушаны закон! МУС Рэспублікі Беларусь было выяўлена выкарыстанне вашай электроннай прылады з процізаконнай мэтай, а менавіта — прагляд і капіраванне відэа з порнасайтаў… Вы пакараны адміністрацыйным штрафам. Грашовую суму памерам у 1 мільён рублёў неабходна пералічыць… У выпадку, калі на працягу 12 гадзін грошы не паступяць на вышэйпаказаны рахунак, у дачыненні вас кампетэнтнымі органамі будзе распачата крымінальнае пераследаванне».

— На жаль, хваля фактаў наведвання інтэрнэткарыстальнікамі старонак махляроў, якія ад імя МУС Беларусі патрабуюць заплаціць штраф за прагляд порнакантэнту, дакацілася і да Гродзеншчыны, — кажа **начальнік аддзела па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій УУС Гродзенскага аблвыканкама, падпалкоўнік міліцыі Сяргей ЧАРНЯК.** — Міністэрства ўнутраных спраў, зразумела, да гэтай рассылкі ніякага дачынення не мае. УП «Адзіны Кашалёк», які прадстаўляе інтарэсы плацежнага сэрвісу Wallet One на тэрыторыі Беларусі, таксама катэгарычна адмаўляе сваё дачыненне да гэтых афер. Таму, калі ў вашым браўзеры адлюстроўваецца падобная інфармацыя, не ўспрымайце тэкст гэтай старонкі за праўду і, зразумела, ні ў якім разе не пералічвайце грошы. Не паддавайцеся на правакацыі!

Барыс ПРАКОПЧЫК

■

■ Крымінал, здарэнні

ЯШЧЭ ДЗВЕ СМЕРЦІ АД СПАЙСУ...

Ранкам у пакоі інтэрната па вуліцы Казінца ў Мінску былі знойдзены целы двух маладых людзей (1995 і 1992 гадоў нараджэння), якія тут пражывалі. 19-гадовы хлопец заўважыў, што двое яго суседзяў па пакоі — рабочыя вытворчых прадпрыемстваў горада — не падаюць прыкмет жыцця. Прыбыўшыя медработнікі канстатавалі смерць...

Паводле інфармацыі ГУУС Мінгарвыканкама, было ўстаноўлена, што напярэдадні ўвечары хлопцы праз інтэрнэт набылі курыльную сумесь. Забраўшы яе з тайніка ў Першамайскім раёне сталіцы, прывезлі спайс у інтэрнат, дзе і спажылі. На працягу сутак сталічныя праваахоўнікі ўстанавілі двух маладых людзей, якія мелі дачыненне да арганізацыі і дзейнасці інтэрнэт-крамы, праз якую і была набыта курыльная сумесь хлопцамі. Адзін з фігурантаў пражываў у Светлагорску, адкуль вёўся інтэрнэт-гандаль міксамі. Яго калега знаходзіўся ў сталіцы і непасрэдна займаўся рэалізацыяй, робячы закладку ў тайнікі. Аперацыю па затрыманні ў Светлагорску і Мінску правялі практычна адначасова. У мінчаніна былі знойдзены пяць пяціграмовых пакецікаў курыльных сумесяў. Ужо падчас першага допыту малады чалавек прызнаў сваё дачыненне да рэалізацыі псіхатропаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗА ТРАНЗІТ ГЕРАІНУ — 13 ГАДОЎ УЗМОЦНЕНАГА РЭЖЫМУ

Суд Магілёўскага раёна асудзіў на 13 гадоў пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму грамадзяніна Казахстана, які арганізаваў канал пастаўкі наркатычных сродкаў.

Як паведамілі ў прэс-службе КДБ, наркагандляра затрымалі ў 2013 годзе ў момант закладкі наркотыкаў у тайнік — стог сена каля трасы Магілёў — Мсціслаў. У стозе былі знойдзены поліэтыленавыя скруткі з геранам — вагой звыш 25 кг. Удалося ўстанавіць, што большая частка партыі наркотыку прызначалася для рэалізацыі ў Заходняй Еўропе.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ВЫКРАДАЛЬНІЦА... ВЕЛАСІПЕДАЎ

Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Партызанскага РУУС сталіцы затрымалі 28-гадовую мінчанку, якая падазраецца ў крадзяжы веласіпедаў.

Дарэчы, дзяўчыну ўжо не раз судзілі за крадзяжы, але на шлях выпраўлення станавіцца не хацела. «Выбраўшы канкрэтную мэту — веласіпеды, — яна здзяйсняла крадзяжы з пад'ездаў дамоў. Скрадзенае збывала праз інтэрнэт», — паведамілі ў РУУС. На дапамогу аператыўнікам прыйшлі відэакамеры, усталяваныя ў пад'ездах жылых дамоў: ужо вядома пра тры факты крадзяжоў, якія ўчыніла затрыманая дзяўчына.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

ОАО «Нафтан»
РЕАЛИЗУЕТ НА КОНКУРСНОЙ ОСНОВЕ
(с повышением начальной цены)
БЫВШЕЕ В УПОТРЕБЛЕНИИ НЕИСПОЛЬЗУЕМОЕ ИМУЩЕСТВО:

Наименование конкурса (пометка на конверте)	Наименование	Инв. №	Год выпуска	Начальная цена с НДС, руб. РБ
Реализация неликвидов. Автотехника.	ВИС-2345	13150610	2001	7 980 000
	ВИС-2345	13150611	2002	7 980 000
	ВАЗ-21093	13150599	2002	9 540 000
	ВАЗ-21093	13150603	2002	9 540 000
	ВАЗ-21093	13150602	2002	9 540 000
	ВАЗ-21093	13150649	2003	9 564 000
	ВАЗ-210430	13150654	2003	13 788 000
	Шевроле Нива 212300	13150711	2005	40 500 000
	Тойота Ленд Крузер	13150511	1997	123 492 000
	ГАЗ-2752	13150782	2006	22 800 000
	Мерседес Бенц 2636 (седельный тягач)	13150127	1989	94 850 400
	Экскаватор-планировщик на шасси МАЗ 631705	04150930	2006	409 200 000
	Мерседес-Бенц 412D (микроавтобус)	13150530	1996	96 720 000
Реализация неликвидов. Мини-трактор.	Мини-трактор АМЖК-8, г.в. 1998, в комплекте с навесным оборудованием: - окучник к мини-трактору - плуг к мини-трактору - прицеп к мини-трактору	04000042	1998	23 040 000
Реализация неликвидов. Станки.	Станок токарно-винтовой ГС526 Б1	06000141	1996	54 636 000
	Станок МН-25Н	06000140	1996	11 700 000
	Станок токарный 16Б16П	06000237	1997	101 280 000
	Станок точильно-шлифовальный	06000153	1996	6 840 000
	Автономная водоотливная установка	06000205	1997	4 368 000
	Автономная водоотливная установка	06000206	1997	4 368 000

Состояние удовлетворительное.
Предложения принимаются по адресу: 211440, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30 по местному времени 13 ноября 2014 года с пометками на конверте, указанными в таблице.
Извещения на проведение конкурса размещены на сайте www.naftan.by.
Контактные телефоны: 8(0214) 59-87-83, 8(0214) 59-89-26, 8(0214) 59-88-42, (033) 398 08 48, (033) 398 07 67. УНП 300042199

Управляющий в деле о банкротстве ЧПТУП «Славинторг» (УНП 490558586, г.п. Лельчицы, дело №121-15Б/2013 от 10.09.2013 в Экономическом Суде Гомельской области) Журов Вячеслав Алексеевич извещает, что свидетельство о государственной регистрации частного производственно-торгового унитарного предприятия «Славинторг» **считать недействительным.**

Тэма стандартызацыі не новая для чытачоў «Звязды». Раней газета знаёміла з вопытам рэгіянальных цэнтраў стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі ў Слуцку, Магілёве, Гомелі, Бабруйску, Лідзе, Барысаве... Але досвед, які апынуўся ў цэнтры ўвагі цяпер, без нацяжкі можна назваць унікальным. У дзейнасці Беларускага дзяржаўнага інстытута стандартызацыі і сертыфікацыі (БелДІСС) занадта многае падыходзіць пад азначэнне «ўпершыню ў практыцы». Невыпадкова ён лічыцца адным з найбольш кампетэнтных інстытутаў у галіне тэхнічнага рэгулявання ў СНД і на працягу многіх гадоў займаецца экспертам ідэй і распрацовак у гэтай сферы.

У гутарцы з карэспандэнтамі «Звязды» прынялі ўдзел дырэктар інстытута кандыдат тэхнічных навук Ірына АСМОЛА, яе намеснікі Аляксандр СКУРАТАЎ і Аляксандр ПАГОДЗІН.

БелДІСС:

САДЗЕЙНІЧАЕМ ПАВЫШЭННЮ ЯКАСЦІ ЖЫЦЦЯ

Ірына АСМОЛА, дырэктар БелДІСС.

Дырэктар БелДІСС Ірына АСМОЛА:

— Сёння — Дзень стандартызацыі. Я хачу пажадаць, каб у нашым калектыве і надалей была невычарпальная колькасць ідэй, якія скіраваны на падтрымку дзяржаўнай палітыкі ў галіне тэхнічнага рэгулявання і павышэння якасці, на падтрымку тых функцый, якія выконвае Дзяржстандарт, каб мы змаглі паспяхова рэалізаваць усе задуманыя праекты.

З прафесійным святам вітаю таксама супрацоўнікаў Дзяржстандарта, рэгіянальных цэнтраў стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі, усіх калег, якія ўносяць свой уклад у развіццё такой патрэбнай для эканомікі і грамадства дзейнасці. Поспехаў у справах, здароўя, міру і дабрабыту!

Аснова безбар'ернага гандлю

— Можам смела сказаць, што мы — галаўная арганізацыя Дзяржстандарта па напрамку, які называецца «Дзяржаўная палітыка ў галіне тэхнічнага рэгулявання», — пачала размову **Ірына Асмола**. — Сферу нашай дзейнасці можна падзяліць на два складнікі. Ёсць вобласці, якія з'яўляюцца абсалютна ўнікальнымі — усяго такіх кірункаў каля 15, і мы ажыццяўляем гэтыя функцыі па даручэнні Дзяржстандарта і пад яго кіраўніцтвам. А ёсць віды дзейнасці, якія выконваем не мы адны, але тым не менш пазіцыянуем сябе лідарамі.

Значную частку нашай работы можна назваць бізнес-напрамкамі, якія пры тым, што вельмі патрэбны краіне, дазваляюць нам развівацца і рухацца далей.

У рамках дзяржаўнай палітыкі, якая ажыццяўляецца ў краіне, галоўная наша функцыя заключаецца ў тым, што мы як нацыянальны інстытут стандартызацыі ўдзельнічаем у распрацоўцы заканадаўчай базы, абавязковых тэхнічных патрабаванняў да прадукцыі і працэсаў, якія павінны будуць выконвацца не толькі ў нашай краіне, але і ў межах Мытнага саюза. Ажыццяўляем разгляд праектаў усіх тэхнічных рэгламентаў, даём свае заўвагі, праводзім экспертную ацэнку, удзельнічаем у рабоце камісій, дзе вядуцца дастаткова гарачыя дэбаты наконт таго, што павінна змяшчацца ў тэхнічных рэгламентах і ў якім выглядзе.

Аляксандр СКУРАТАЎ, намеснік дырэктара па тэхнічным рэгуляванні, стандартызацыі і інфарматызацыі.

Інстытут з'яўляецца непасрэдным распрацоўшчыкам шэрагу тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза — напрыклад, на нізкавольтнае абсталяванне, электрамагнітную сумяшчальнасць тэхнічных сродкаў, маркіроўку харчовай прадукцыі, цацкі, сельска- і лесагаспадарчыя трактары і прычэпы да іх. Сёння распрацоўваем тэхнічны рэгламент аб абмежаванні прымянення шкодных рэчываў у электратэхнічных і радыёэлектронных вырабах. Усяго ў рамках Мытнага саюза сёння прыняты 34 тэхнічныя рэгламенты. Прычым 5 з 7 распрацаваных Рэспублікай Беларусь — гэта распрацоўкі БелДІСС. Такім чынам, мы непасрэдна ўплываем на тое, каб у краіне і ў Мытным саюзе выпускалася бяспечная прадукцыя, былі належныя ўмовы яе вытворчасці і абаронены здароўе і жыццё грамадзян, а таксама навакольнае асяроддзе.

Інстытут — «рукі» Дзяржстандарта ў частцы аналізу ўкаранення патрабаванняў тэхнічных рэгламентаў у Рэспубліцы Беларусь. Гэта важны складнік нашай дзейнасці, вельмі актуальны для краіны ва ўмовах інтэнсіўнага развіцця еўразійскай інтэграцыі.

Для выканання тэхнічных рэгламентаў, а таксама для павышэння якасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі, што выпускаецца, ва ўсім свеце выкарыстоўваюць такі інструмент, як стандартызацыя. Дакументы, якія прапануюць і вытворцам, і спажыўцам лепшую практыку з пункту гледжання паказчыкаў прадукцыі ці паслуг, — гэта і ёсць стандарты. І мы сёння з'яўляемся актыўнымі ўдзельнікамі працэсу іх распрацоўкі. Акрамя гэтага, праз нас праходзяць усе стандарты, якія распрацоўваюцца ў нашай краіне, мы праводзім іх навукова-тэхнічную экспертызу. Інстытут — апошняя інстанцыя перад тым, як Дзяржстандарт прымае рашэнне аб зацвярджэнні і ўвядзенні іх у дзеянне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Трэба сказаць, што пасля стварэння Мытнага саюза ў нас адчувальна дабавілася работы. Напрыклад, калі да гэтага трэба было арганізаваць разгляд і разгледзець за год недзе 100 міждзяржаўных стандартаў (ДАСТ), якія распрацоўваліся для краін СНД, то цяпер гэтая лічба набліжаецца да 2000.

Слова бярэ Аляксандр Скуратаў, (у інстытуце ён адказвае за працэсы тэхнічнага нармавання, стандартызацыі і інфарматызацыі):

— Справа ў тым, што ў Мытным саюзе прыярытэтным з'яўляецца прымяненне ДАСТ. Іменна праз іх забяспечваецца выкананне патрабаванняў тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза. У сучасных умовах, гэтак жа як і пасля распаду СССР у пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя, выкарыстанне ДАСТ дазваляе захаваць магчымасць безбар'ернага гандлю на постсавецкай прасторы. А для нашай краіны — гэта найважнейшы рынак збыту прадукцыі.

На сённяшні дзень дзейнічае каля 20 тысяч такіх стандартаў. Частка дакументаў з таго часу змянілася, але іншыя дзейнічаюць. Работа па актуалізацыі гэтага фонду дастаткова сістэмна ажыццяўляецца краінамі — удзельніцамі СНД.

— Наколькі можна зразумець, распрацоўка стандартаў — справа «мнагаслойная», скажам так. Але ж і напрамкі стандартызацыі вельмі разнастайныя...

— Так, сапраўды, і адзінае, чым мы не займаемся — пытаннямі стандартызацыі ў галіне будаўніцтва, бо там існуе ўласная галіновая арганізацыя.

Сёння мы распрацоўваем стандарты ў харчовай галіне, у машынабудаванні, электратэхніцы, энергазберажэнні, сферы паслуг, інфармацыйных тэхналогіях і гэтак далей. Нават удзельнічаем у праектах, звязаных з распрацоўкай дзяржаўных стандартаў для касмічнай галіны і для атамнай энергетыкі. Сфера нашых інтарэсаў, як бачыце, надзвычай разнастайная.

Спецыфіка інстытута заключаецца яшчэ ў тым, што ў нас ёсць метадалагічныя падраздзяленні, задача якіх — вызначаць, як і куды, у якім напрамку павінна рухацца наша дзейнасць. Для гэтага яны праводзяць аналіз усяго новага, што з'яўляецца ў свеце, таго, чым займаюцца нашы партнёры, вывучаюць еўрапейскі і міжнародны досвед і ўносяць у якасці прапаноў свае наватарскія праекты. Дзякуючы рабоце такіх навуковых падраздзяленняў мы можам паўнапраўна ўдзельнічаць не толькі ў працэсах удасканалення тэхнічнай палітыкі ўнутры нашай краіны, але і ў рамках Мытнага саюза і СНД.

— Нішто так не пераконвае, як добры прыклад...

— Тут можна назваць шэраг новых стандартаў, якія пачалі дзейнічаць у 2014 годзе. Скажам, па бяспецы землярыйных машын мы выпусцілі серыю міждзяржаўных стандартаў на падставе еўрапейскіх нормаў. Яны закрылі ўсе патрабаванні ў гэтай галіне як да вытворцаў, так і да спажыўцоў. Размова ідзе пра пагрузчыкі, машыны гарызантальнага бурэння, бульдозеры, экскаватары, аўтагрэйдары, землявозы — усю наменклатуру такой тэхнікі.

Цікавая серыя міждзяржаўных стандартаў за гэты год з'явілася ў галіне хіміі і нафтахіміі. Мы таксама актыўна ўдзельнічаем у распрацоўцы метадалагічных стандартаў — як праводзіць выпрабаванні прадукцыі, яе сертыфікацыю і гэтак далей.

Актуальным кірункам з'яўляецца распрацоўка стандартаў у галіне вытворчасці так званай арганічнай прадукцыі — яна вырабляецца без прымянення пестыцыдаў, разнастайных хімікатаў, геннамадыфікаваных арганізмаў і вырашчана на палях, якія правільна апрацоўваюць. Навукоўцы сцвярджаюць: гэта найбольш бяспечная для чалавека прадукцыя. Сёння гэты трэнд атрымаў дастаткова шырокае развіццё ў краінах Еўрасаюза, і лічыцца, што з цягам часу Беларусь можа стаць паўнапраўным удзельнікам працэсу пастаўкі такой прадукцыі на рынак Еўропы.

На сучаснай інфармацыйнай платформе

— Наколькі мы разумеем, адной з асноўных задач Дзяржстандарта і яго арганізацый з'яўляецца інфармацыйнае забеспячэнне суб'ектаў гаспадарання, прадастаўленне ім доступу да існуючай тэхнічнай нарматыўнай прававой базы.

А. Скуратаў. З гэтай мэтай створаны Нацыянальны фонд тэхнічных нарматыўных прававых актаў (ТНПА), вядзенне якога ажыццяўляе БелДІСС. Сёння ў ім змешчана больш за 200 000 дакументаў, з іх больш за 26 000 датычацца патрабаванняў унутранага рынку.

Унікальныя прадукты ёсць у інстытута і ў гэтым напрамку. Нам удалося сфарміраваць унікальны рэсурс — поўнатэкставую базу даных усяго тэхнічнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь, Рэспублікі Казахстан і Расійскай Федэрацыі, якая ўключае як тэхнічныя рэгламенты Мытнага саюза, так і нацыянальныя стандарты трох краін. Гэтая сістэма даступная праз сетку інтэрнэт пры дапамозе парольнага доступу.

Гэты рэсурс — адзін з модуляў сістэмы комплекснага інфармацыйнага забеспячэння, накіраванай не толькі на прадастаўленне інфармацыі аб ТНПА, але і аўтаматызацыю працэсаў планавання і распрацоўкі стандартаў, іх выдання, а таксама фарміравання і вядзення фондаў дакументаў на прадпрыемствах. Напрыклад, на БелАЗе ці «Атланце» ТНПА ўключаюць у сябе тысячы адзінак, якія яны выкарыстоўваюць у працэсе вытворчасці. На фарміраванне і падтрыманне, актуалізацыю такіх фондаў трацяцца істотныя сродкі. Выкарыстанне нашай сістэмы (зазначу: з нашай пастаяннай дапамогай, нашым куратарствам) дазваляе прадпрыемствам істотна скараціць свае затраты.

Мы сёння маем каля 1000 карыстальнікаў гэтай сістэмы толькі на тэрыторыі рэспублікі. Значыць, прамысловасць прымае новую тэхналогію і імкнецца павышаць эфектыўнасць сваёй дзейнасці ў гэтым кірунку. А тым, хто пакуль больш ахвотна карыстаецца папяровымі носьбітамі інфармацыі, можа дапамагчы наш магазін «Стандарты», размешчаны ў інстытуце.

Асобна адзначу, што БелДІСС таксама вядзе базы даных міжнародных і рэгіянальных арганізацый па стандартызацыі, спецыялізаваных арганізацый розных краін, напрыклад, ключавых арганізацый у харчовай сферы, нафтахіміі і гэтак далей. Пры распрацоўцы стандартаў, новай прадукцыі, экспертных паставак мы абапіраемся на іх даследаванні, на іх вопыт і веды. Можам любому нашаму прадпрыемству набыць патрэбныя яму для работы міжнародныя стандарты. Гэта форма нашай дапамогі прадпрыемствам-экспарцёрам.

Тэхнічная прадукцыя — асноўны напрамак дзейнасці выпрабавальнага цэнтра.

І. Асмола. Сёння яшчэ ёсць прыклады, калі прадпрыемства несвоечасова звярнулася да нашага рэсурсу і сутыкнулася з праблемамі ў рэалізацыі. Прадукцыю спынілі на мяжы, бо змяніліся патрабаванні да яе. Таму, атрымаўшы пропуск на сусветныя рынкі, прадпрыемства павінна ўважліва адсочваць усе змены ў заканадаўстве замежных краін, якія тычацца яго прадукцыі, інакш лёгка стаць неканкурэнтаздольным ці проста страціць права доступу на той ці іншы рынак. З'явіліся змены ў патрабаваннях — арганізацыя павінна рэагаваць. Дзякуючы нашай сістэме прадпрыемствы амаль у рэжыме анлайн могуць бачыць, што змянілася, як змянілася і да чаго трэба імкнуцца.

Адпавядае ўсім патрабаванням

А. Пагодзін. Я хацеў бы крыху сказаць пра работу выпрабавальнага цэнтра, за дзейнасць якога адказваю.

Яго работнікі, напрыклад, выпрабоўваюць прадукцыю айчынных вытворцаў на стадыі распрацоўкі і пастаноўкі на паток. На жаль, бывае так, што дакументы, стандарты — як еўрапейскія, так і тыя, што прымаюцца ў рамках Мытнага саюза, айчынныя канструктары не чытаюць і не ведаюць. Гэта высвятляецца, калі прадукцыя паступае да нас на выпрабаванні. Мы дапамагаем яе «даводзіць» да ўзроўню, які патрабуецца, выпраўляць усе неадпаведнасці, а гэта зайсёды доўга, нават у рамках Мытнага саюза.

Што датычыць пастаўкі прадукцыі ў Еўрапейскі саюз, то наш інстытут удзельнічае ў экспартнай праграме беларускіх прадпрыемстваў з 2004 года. І пачалася яна з таго, што БелДІСС заключыў пагадненне з інстытутамі шэрагу краін Еўрасаюза аб прызнанні вынікаў нашых выпрабаванняў. Гэта дазваляе нашым вытворцам праходзіць неабходныя працэдуры непасрэдна ў нас і пры станоўчых выніках атрымліваць права наносіць на сваю прадукцыю СЕ-маркіроўку, якая сведчыць, што прадукцыя бяспечная. Без такой маркіроўкі мяжу на еўрапейскі рынак не перасячэш. За гэты час (з 2004 года) з нашай дапамогай права маркіраваць прадукцыю запаветнай абрэвіятурай атрымалі прыкладна паўтары тысячы мадэляў і мадыфікацый айчынных тавараў. Нам таксама даручана праз некаторы час пасля атрымання прадпрыемствам права маркіраваць прадукцыю знакам СЕ праводзіць інспекцыйны кантроль. Беларускія вытворцы пры гэтым таксама эканомяць валюту, бо раней такі кантроль праводзілі выключна замежныя інстытуты.

І. Асмола. Нават калі прадукцыя не ўваходзіць у сферу акрэдытацыі нашага цэнтра, мы праз еўрапейскіх калег дапамагаем знайсці лабараторыю, якая магла б правесці такія выпрабаванні і аформіць вынік. Інакш кажучы, каардынуем гэтую работу. Трэба мець на ўвазе, што асноўны кірунак дзейнасці выпрабавальнага цэнтра — чыста тэхнічная прадукцыя. Гэта прадукцыя машынабудавання, разнастайны інструмент, электраўстановачныя вырабы, медыцынская тэхніка — інакш кажучы, усё, што ўстаўляецца ў разетку.

Аляксандр ПАГОДЗІН, намеснік дырэктара па сертыфікацыі і выпрабаваннях.

А. Пагодзін. Праводзім выпрабаванні і ў рамках пацвярджэння адпаведнасці прадукцыі патрабаванням 7 тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза, якія датычацца нізкавольтнага абсталявання, электрамагнітнай сумяшчальнасці, машын, транспартных сродкаў, цацак, сродкаў індывідуальнай абароны, прадукцыі для дзяцей.

Акрамя выпрабавальнага цэнтра ёсць і орган па сертыфікацыі прадукцыі. Галіны акрэдытацыі ў іх працэнтаў на 80 супадаюць, і для кліента гэта зручна: усе працэдуры можна прайсці, што называецца, у адным месцы.

І. Асмола. Вось што яшчэ важна. У нас праходзяць выпрабаванні і працэдуры пацвярджэння сваёй бяспечнасці і тыя тавары, якія завозяцца на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь — а цяпер гэта ўжо лічыцца і тэрыторыяй Мытнага саюза — з еўрапейскіх і іншых краін. Свайго роду бар'ер, каб не завозілася няякасная ці шкодная для здароўя прадукцыя.

А. Пагодзін. Так, галоўная мэта — абарона жыцця і здароўя чалавека. Сёлета было праведзена каля 2000 выпрабаванняў, з іх больш чым за сотню атрымалі адмоўны вынік, і тавар не быў прапушчаны на тэрыторыю Беларусі.

Адзначу таксама, што лабараторыі нашага выпрабавальнага цэнтра аснашчаны сучасным і ўнікальным абсталяваннем, якое дазваляе атрымліваць дакладныя і аб'ектыўныя вынікі. Такое абсталяванне не заўсёды ёсць у нашых калег.

І калі працягваць тэму ўнікальнасці, то ў інстытуце працуюць дзве даволі цікавыя лабараторыі. Першая — па выпрабаваннях касавых падсумавальных апаратаў, другая — па выпрабаваннях гульнявых апаратаў. Абедзьве праводзяць выпрабаванні і экспертызу гэтых вырабаў з мэтай уключэння ў адпаведныя дзяржаўныя рэестры, што дазваляюць іх выкарыстанне на тэрыторыі нашай краіны. Такім чынам, інстытут займаецца забеспячэннем іх вядзення — гэтую функцыю нам даверыў Дзяржстандарт.

І. Асмола. Сёння адна са стратэгічных і найскладанейшых задач, рэалізацыяй якой займаецца інстытут, гэта тое, што ў рамках міжнароднага праекта тэхнічнай дапамогі, пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага саюза і ўрада нашай краіны, мы ствараем яшчэ адну ўнікальную лабараторыю — па вызначэнні энергаэфектыўнасці (перш за ўсё ашчаднасці) шырокай гамы бытавых электрапрыбораў і прамысловай прадукцыі. Лабараторыя стане цудоўнай стартавай пляцоўкай для нашых вытворцаў для пашырэння экспарту канкурэнтаздольнай і энергаэканомнай прадукцыі.

І яшчэ. Гаворачы пра тэму канкурэнтаздольнасці, нельга не сказаць пра яшчэ адзін важны кірунак нашай дзейнасці. Інстытут сёння самы вялікі і з шырокім спектрам паслуг орган па сертыфікацыі сістэм менеджменту. Па сутнасці, гэта сістэма кіравання прадпрыемствам, рознымі аспектамі яго жыццядзейнасці. Існуюць патрабаванні ў выглядзе стандартаў да сістэм менеджменту якасці, сістэм кіравання аховай працы, навакольным асяроддзем, менеджменту харчовай і інфармацыйнай бяспекі, энергаменеджменту. У аснове гэтых патрабаванняў — лепшыя дасягненні сусветнай вытворчай практыкі, абапірацца на якія кожны працоўны калектыў проста павінен, каб дзейнічаць больш эфектыўна і быць канкурэнтаздольным у сучасных умовах.

Як сацыяльна арыентаваная дзяржава, Беларусь клапоціцца пра тое, каб грамадзянам аказваліся якасныя паслугі. Таму інстытут займаецца сертыфікацыяй і класіфікацыяй гасцініц, лагістычных паслуг. Праводзіцца таксама сертыфікацыя цэнтраў па тэхнічным абслугоўванні і рамонце бытавой радыёэлектроннай апаратуры, цырульняў і гэтак далей.

...Можна многа расказваць аб напрамках дзейнасці БелДІСС — аб працы інстытута па арганізацыйна-тэхнічным забеспячэнні дзяржаўных конкурсаў у галіне якасці (у тым ліку конкурсу на саіскання прэміі ўрада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці), конкурсаў і алімпіяд сярод студэнтаў і маладых спецыялістаў. А таксама як выдаўцоў цэлага шэрагу спецыялізаваных выданняў, у тым ліку часопіса «Стандартизация». Тэматычныя падраздзяленні інстытута выпускаюць штогод цэлыя блокі метадычных дапаможнікаў і рэкамендацый, праводзяць семінары і канферэнцыі. Але гэта ўсё — тэма для наступнай сустрэчы і публікацыі.

Адзінае, пра што хацелася б сказаць у заключэнне і на што звярнуць увагу чытачоў: усе напрамкі дзейнасці, якія сёння ажыццяўляе калектыў БелДІСС пры падтрымцы Дзяржстандарта, аб'ядноўвае адзіная мэта — садзейнічанне павышэнню якасці. Якасці не толькі прадукцыі, тавараў ці паслуг, а нагул — якасці нашага з вамі жыцця. Згадзіцеся, гэта вельмі ганаровая і вельмі адказная справа.

Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

Ім стварацьбудучыню інстытута.

У Нацыянальным фондзе ТНПА выкарыстоўваюцца як традыцыйныя формы работы, так і сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі.

— Так, мы імкнёмся, каб нашы стандарты былі гарманізаваны з міжнароднымі і еўрапейскімі. Такая палітыка вызначана і падтрымліваецца на дзяржаўным узроўні. Бо толькі ў гэтым выпадку для нашых вытворцаў будуць стварацца найбольш спрыяльныя ўмовы для пастаўкі прадукцыі на знешнія рынкі. У нас ёсць арыгінальныя стандарты, унікальныя для нашай краіны, але большасць распрацоўваецца на падставе міжнародных і еўрапейскіх нормаў, што адпавядае агульнай палітыцы ў рамках пагаднення Сусветнай гандлёвай арганізацыі (СГА) па тэхнічных бар'ерах у гандлі.

— Цікава, якім жа чынам ажыццяўляецца сама распрацоўка стандарту?

— У сусветнай практыцы найбольш эфектыўнай формай для

БелДІСС — цэнтральнае дзяржаўнае навукова-практычнае прадпрыемства Дзяржстандарта ў галіне тэхнічнага нармавання і стандартызацыі, ацэнкі адпаведнасці і сістэм менеджменту.

Фіналіст 6-га Міжнароднага турніру па якасці краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (2010).

Пераможца конкурсу «Кампетэнтнасць-2013» у намінацыі «Найлепшая практыка ў галіне сістэм менеджменту».

Акрэдытаваны ў якасці навуковай арганізацыі.

Афіліраваны член у Еўрапейскай арганізацыі па якасці.

Сістэма менеджменту якасці сертыфікавана на адпаведнасць патрабаванням СТБ ISO 9001.

БелДІСС
г. Мінск, вул. Мележа, д. 3
220113, Рэспубліка Беларусь
тэл. (017) 262 05 52
тэл./факс (017) 262 15 20
belgiss@mail.belpak.by
www.belgiss.by

УНП 100219737

Распрацоўка стандартаў — справа калектыўная.

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» извещает о проведении 18 ноября 2014 г. аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества в рамках 160-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности

№ предмета аукциона	Местонахождение имущества	Площадь (кв. м)	Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы	Начальная цена права заключения договора аренды имущества (руб.)	Целевое использование имущества	Сумма задатка (руб.)	Характеристика имущества
Арендодатель – РУП «Управляющая компания холдинга «Белавтодор», *тел. +375(17)259 84 44*							
107	г. Минск, ул. Пионерская, 37	331,8	3,0	10 341 672	Под административные цели (офис) (за исключением общественных объединений, коллегии адвокатов, центров поддержки предпринимательства)	1 034 100	Двухэтажное административное здание (капитальное строение с инв. № 500/С-15276) общей площадью 331,8 кв.м, и дворовых сооружений, относящиеся к данному зданию (проезд, площадка под мусорные баки, бордюр, ворота, калитка, ограждение, шлагбаум). В здании имеются – отопление, водопровод, канализация, электроснабжение. Также в здании установлено 7 кондиционеров и имеется собственная котельная. Договор аренды заключается сроком на 3 года

Договор аренды по предмету аукциона № 107 заключается на 3 года.

Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10.

Аукцион состоится **18 ноября 2014 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Возможность **осмотра Имущества**, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, **обеспечивает арендодатель**. Организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнять у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), а также размер коммунальных платежей.

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, а также иными актами законодательства.

Участвовать в аукционе могут юридические и физические лица, включая индивидуальных предпринимателей.

Лицо, желающее принять участие в аукционе:

- уплачивает задаток (юридические лица и индивидуальные предприниматели оплату производят **платежным поручением**!) по соответствующему предмету торгов (назначение платежа – **задаток для участия в аукционе № 160 от 18.11.2014 по предмету аукциона №**), перечисляемый на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», код 153001369, УНП 190398583, УП «Минский городской центр недвижимости» (сумма задатка по каждому предмету торгов указана в соответствующей графе таблицы). **Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов;**

- подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе с приложением следующих документов (бланк заявления можно получить у организатора аукциона):

юридическое лицо – резидент Республики Беларусь:

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь:

легализованной в установленном порядке копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иного эквивалентного доказательства юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

копии **платежного поручения** либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

индивидуальный предприниматель:

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

физическое лицо – копии платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

- заключает с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), бланк которого можно получить у организатора аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами и заключении соглашения:

физическое лицо, индивидуальный предприниматель предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность;

представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 17 октября 2014 г. по 12 ноября 2014 г. включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

Порядок оформления участия в аукционе: лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. *При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.*

Порядок определения победителя аукциона:

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 15 000 000 рублей.

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить **на текущий (расчетный) счет арендодателя** сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. **Информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона**.

Важно! *Договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом). Заключение договора аренды помещения, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается.*

Договора аренды имущества должны быть заключены в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

Телефоны для справок: отдел аукционов – + 375 (17) 327 40 22, **отдел аренды** – + 375 (17) 327 41 70, 327 47 29, 328 36 57, **бухгалтерия** – + 375 (17) 328 36 58. **Интернет: www.mgcn.by.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЙ РУП «Белорусский радиотелевизионный передающий центр»

№ лота	1	2	3
Наименование, местонахождение и характеристика объекта	право заключения договора аренды помещения общей площадью 402,2 кв.м (характеристика: имеются – канализация, водоснабжение, электроснабжение) на 1-м этаже в административно-хозяйственном здании (инв. № 100/С-4056) по ул. Коммерческая, 26/2 в г. Бресте	право заключения договора аренды помещения общей площадью 75,7 кв.м (характеристика: сети отсутствуют) на 1-м этаже в подсобном здании (инв. № 100/С-55153) по ул. Коммерческая, 26/2 в г. Бресте	право заключения договора аренды помещения общей площадью 48,9 кв.м (характеристика: имеются – канализация, водоснабжение, электроснабжение) на 1-м этаже в проходной (инв. № 100/С-4055) по ул. Коммерческая, 26/2 в г. Бресте
Балансодержатель	РУП «Белорусский радиотелевизионный передающий центр»		
Начальная цена продажи (руб.)	10 256 100	1 930 350	1 246 950
Сумма задатка (руб.)	1 025 000	193 000	124 000
Срок аренды	5 лет	5 лет	5 лет
Ставка арендной платы либо размер коэффициента к базовой ставке арендной платы	2,0	2,0	2,0
Условия оплаты	разовый платеж		
Размер штрафа, руб.	15 000 000		
Условия продажи	для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств)	для размещения складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств)	для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств)
Организатор аукционных торгов	КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»		

ПРИМЕЧАНИЕ:

Для участия в аукционе юридических или физических лиц, в том числе индивидуальных предпринимателей, прилагаются к заявлению, подаваемому:

1. юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь:

копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

2. юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь:

легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

копия платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

3. индивидуальным предпринимателем:

копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

4. физическим лицом – копия платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона.

